Купляць валюту трэба ўважліва!

СТАР. 4

Беларускія аграгарадкі ўражваюць Мазамбік

СТАР. 5

Хто стане другім фіналістам мундзіялю?

СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

9 ЛІПЕНЯ 2014 г. СЕРАДА № 126 (27736) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ІМКЛІВЫ ЧАС — ІМКЛІВЫЯ СРОДКІ

ПРЭЗІДЭНТ ПАДКРЭСЛІВАЕ ВАЖНАСЦЬ ПАВЫШЭННЯ МАБІЛЬНАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ АРМІІ

На гэты факт Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу ў час наведвання 103-й асобнай гвардзейскай мабільнай брыгады сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Беларусі, паведамляе БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы агледзеў парк баявых машын, дзе азнаёміўся з яго абсталяваннем і станам тэхнікі, перспектывамі яго ўдасканалення. Прэзідэнт паглядзеў, як арганізавана работа па тэхнічным абслугоўванні і рамонце ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што беларускую армію неабходна забяспечваць мабільнымі сродкамі. Прэзідэнту быў прадэманстраваны адзін з узораў такіх машын, якія збіраюцца на Мінскім заводзе колавых цягачоў з выкарыстаннем расійскіх камплектуючых. Прэзідэнт даручыў максімальна лакалізаваць вытворчасць падобнай тэхнікі ў Беларусі, звярнуўшы пільную ўвагу на якасць. Аляксандр Лукашэнка лічыць гэта перспектыўным узбраеннем.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся тэрмінамі мадэрнізацыі тэхнікі, якая знаходзіцца на балансе ў часцях Узброеных Сіл. Як было даложана Прэзідэнту, гэтая праца завершыцца ў 2017–2018 гадах.

Агледзеўшы салдацкую сталовую і заслухаўшы даклад аб тым, як арганізавана харчовае забеспячэнне Узброеных Сіл і сіл спецыяльных аперацый, Аляксандр Лукашэнка папрасіў міністра абароны даць яму на пробу некалькі сухіх пайкоў і кансервы. Як было даложана кіраўніку дзяржавы, у гэтым годзе былі зменены нормы харчовых пайкоў — з улікам энергазатрат вайскоўцаў.

Аляксандр Лукашэнка пабываў таксама ў вучэбным корпусе, азнаёміўшыся з абсталяваннем класаў, узбраеннем і экіпіроўкай ваеннаслужачых падраздзяленняў спецыяльнага прызначэння. Прэзідэнт наведаў шматмэтавы комплекс, які ўяўляе сабой гарадок тактыка-спецыяльнай падрыхтоўкі і паветрана-дэсантны комплекс. Ён паглядзеў, як вядзецца падрыхтоўка байцоў, і застаўся задаволены ўбачаным. Па словах камандзіра 103-й асобнай мабільнай брыгады, існуючая база дазваляе ажыццяўляць падрыхтоўку вайскоўцаў на належным узроўні.

ВАЛОШКАВЫ НАСТРОЙ

Фота БЕЛТА

ЛІЧБА ДНЯ

На $866,8 млн

прадалі беларусы ў чэрвені наяўнай і безнаяўнай валюты (за студзень-чэрвень — $4 млрд 751,4 млн) у эквіваленце. Набылі — $898,8 млн (за студзень-чэрвень — $4 млрд 990,8 млн). Гэтыя даныя сведчаць аб тым, што насельніцтва краіны ў чэрвені значна паменшыла набыццё замежнай валюты. Чыстая купля замежнай валюты за чэрвень — $32 млн, што ў 3,7 раза менш у параўнанні з аналагічным паказчыкам мая, які складаў $117,3 млн.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+26°
Віцебск	+25°
Гомель	+26°
Гродна	+27°
Магілёў	+25°
Мінск	+26°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.07.2014 г.

Долар ЗША	10230,00	▲
Еўра	13910,00	▲
Рас. руб.	297,00	▲
Укр. грыўня	872,87	▲

■ Сакрэт поспеху

ВЫДАТНІКІ ВЫБІРАЮЦЬ ВЫСОКІЯ ТЭХНАЛОГІІ

Уладальнікі двух стабальных сертыфікатаў займаліся з рэпетытарамі і на факультатывах

Набраць сто балаў на цэнтралізаваным тэсціраванні — задача цяжкая, але выканальная. Сёлета пятнаццаць абітурыентаў паказалі найвышэйшыя рэзультаты пры здачы тэстаў па беларускай мове, дваццаць пяць чалавек безпамылкова выканалі заданні па мове рускай. А вось уладальнікі адразу двух стабальных сертыфікатаў — сёлета рэдкасць. Толькі тры абітурыенты ў краіне дамагліся такога выніку, фактычна забяспечыўшы сабе месцы ў лепшых ВНУ Беларусі. Карэспандэнт «Звязды» звязаўся з двума героямі ўступнай кампаніі і даведаўся аб сакрэтах іх поспеху.

СТАР. 3

■ Наша спадчына

ПРАДАЕЦЦА СЯДЗІБА. ДОРАГА

ЧАМУ СЫХОДЗЯЦЬ У НЯБЫТ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ?

Ад слаўнай мінуўшчыны нашай краіне дасталіся сотні старадаўніх шляхецкіх сядзіб — былога ўвасаблення заможнасці і раскошы, а сёння — помнікаў архітэктуры розных эпох. Праўда, у многіх з іх ад колішняй велічы засталіся непрыкметныя руіны: былыя маёнткі дзесяцігоддзямі пустуюць і не выкарыстоўваюцца, таму працэс разбурэння няўмольна накладае на іх свой адбітак. Цяпер у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі занесены 173 шляхецкія сядзібы. Безумоўна, захавалася іх нашмат больш, але не ўсе яны маюць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і не на ўсе распаўсюджваецца закон аб захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. У адпаведнасці з заканадаўствам, любая фізічная ці юрыдычная асоба можа прапанаваць на разгляд Рэспубліканскай навукова-метадычнага савета пытанне аб наданні статусу каштоўнасці аб'екту, у тым ліку і сядзібе, так што тэарэтычна захаванне нашага архітэктурнага багацця залежыць у тым ліку і ад нас, грамадзян.

СТАР. 3

■ Спажывец

ЧЫМ БОЛЬШЫЯ ЗНІЖКІ, ТЫМ ТАНЧЭЙШЫ КАШАЛЁК

Спакусіўшыся на нізкую цану, мы купляем зусім не патрэбныя рэчы

Калі пакупнік заходзіць у харчовы магазін буйной гандлёвай сеткі, то ў самым пачатку шляху да стэлажоў ён можа назіраць мноства ўсялякіх тавараў са зніжкамі. Прычым зніжкі бываюць самыя разнастайныя: ад сімвалічных 5% да істотных 50% і вышэй. Тут пакупнік разумее, што ў яго ёсць шанц танней купіць тавары, якія ён мог бы не купляць у гэты момант у сілу іх звычайнай дарагавізны і адсутнасці ў іх тэрміновай патрэбы. Атрымліваецца, што купіў танней, але, разам з тым, патраціў больш, чым запланаваў, на паход у краму…

Аднак гэта можа быць яшчэ не ўсё: у прадукту, які толькі што быў набыты па зніжцы, у бліжэйшы месяц скончыцца тэрмін прыдатнасці. Альбо калі гэта садавіна ці агародніна, то яны, магчыма, будуць далёка ўжо не першай свежасці. Для таго, каб разабрацца ў пытанні, чаму мы часта трацім больш, калі купляем па зніжцы, неабходна звярнуцца да маркетынгавых аспектаў вядзення гандлю. І пачаць трэба менавіта з таго, якія самыя папулярныя зніжкі бываюць у харчовых крамах і чаму іх робяць.

СТАР. 4

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



АБДУЛА АБДУЛА АБВЯСЦІЎ СЯБЕ ПЕРАМОЖЦАМ

Былы міністр замежных спраў Афганістана Абдула Абдула, не чакаючы афіцыйнага абвяшчэння вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, абвясціў сябе пераможцам другога тура. Гэтую заяву з захапленнем сустрэлі тысячы яго прыхільнікаў, якія выйшлі ў цэнтр Кабула. Такім чынам, Абдула яшчэ і праігнараваў пагрозы ЗША: Вашынгтон паабяцаў спыніць фінансавую дапамогу Афганістану ў выпадку зрыву дэмакратычных выбараў і спробаў захопу ўлады незаконным шляхам. Напярэдадні незалежная выбарчая камісія Афганістана абвясціла, што, па папярэдніх даных, перамогу атрымаў экс-міністр фінансаў Ашраф Гані Ахмадзай, які набраў 56,44% галасоў. Гэтая заява выклікала незадаволенасць з боку Абдулы і яго прыхільнікаў, паколькі ў першым туры ён значна апярэджваў саперніка: за экс-кіраўніка МЗС прагаласавалі 45% выбаршчыкаў, а за экс-міністра фінансаў — 31,6%.

ДОЎГ УКРАІНЫ ЗА ГАЗ ВЫРАС ДА 5,3 МЛРД ДОЛАРАЎ

Кампанія «Нафтагаз Украіны» не аплаціла ва ўстаноўлены тэрмін пастаўкі расійскага газу ў чэрвені, паведаміў «Газпрам». У выніку агульны доўг Украіны перад РФ за газ вырас да 5,296 млрд долараў (з разліку ў 485,5 долара за тысячу кубаметраў). Неаплачанымі застаюцца 11,535 млрд кубаметраў расійскага газу. Гэта велізарны аб'ём, супастаўны з гадавымі пастаўкамі расійскага газу ў Польшчу, удакладнілі ў «Газпраме». Тым часам Расія распачала новыя спробы выратаваць праект будаўніцтва газаправода «Паўднёвы паток», па якім газ павінен паступаць па дне Чорнага мора ў краіны Паўднёвай і Цэнтральнай Еўропы ў абход Украіны. Супраць гэтага будаўніцтва выказаўся Еўрасаюз.

ПАЎМІЛЬЁНА ЯПОНЦАЎ ЭВАКУІРУЮЦЬ З-ЗА ТАЙФУНУ

Да берагоў Японіі набліжаецца наймацнейшы тайфун «Неагуры». На поўдні Японіі ў прэфектуры Акінава з-за стыхіі аб'яўлена эвакуацыя амаль 500 тыс. чалавек, паведамляюць інфармагенцтвы. Тайфун «Неагуры» названы адным з самых магутных за апошняе дзесяцігоддзе. Ён суправаджаецца праліўным дажджом, шквалістым ветрам і высокімі хвалямі як на моры, так і каля ўзбярэжжа: вышыня хвалі на моры можа дасягаць 14 м.

Больш за 22 тыс. дамоў прэфектуры Акінава ўжо засталіся без электраэнергіі з-за абрыву правадоў. Таксама поўнасцю спынены паветраныя зносіны на поўдні Японіі. Адменены выхады ў мора ўсіх пасажырскіх паромаў і суднаў. На Акінаве спынены рух па хуткаснай аўтамабільнай трасе. Спынены рух і адзінай чыгуначнай лініі на востраве. Закрыты ўсе школы і дзіцячыя сады.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ВУГЛЯВОДЫ АДЫМАЮЦЬ У ЗДАРОВЫХ ЛЮДЗЕЙ ПАМЯЦЬ

Актыўнае спажыванне цукру або любога іншага вуглявода негатыўна адбіваецца на структуры і працы мозга. Па гэтай прычыне ў людзей з дыябетам павышана рызыка прыдуркаватасці і наяўнасці паменшанага гіпакампа (зоны, важнай для памяці), піша Scientfic American. На гэты раз навукоўцы Універсітэта Шарытэ вырашылі зразумець, ці ўплывае цукар на мозг здаровых людзей. Яны сабралі 141 добраахвотніка, якім было прапанавана прайсці тэст на памяць і даследаванне гіпакампа. Аказалася, што два маркеры глюкозы (кароткачасовага і працяглага) былі звязаны з пагаршэннем памяці, памяншэннем гіпакампа і парушэннем яго структуры (назіралася частковая атрафія). Атрымліваецца, што нават калі ў чалавека няма дыябету і інсулінавай рэзістэнтнасці, высокая канцэнтрацыя цукру можа парушыць памяць і пашкодзіць мозг. Цяпер навукоўцы збіраюцца высветліць, як змяненне ладу жыцця на карысць адмовы ад цукру адаб'ецца на стане мозга.

КОРАТКА

Беларусь пачала планавае пагашэнне стабілізацыйнага крэдыту Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС, выплаціўшы першыя $88,3 млн.

Медыкі рэкамендуюць зрабіць прышчэпку перад паездкай у краіны з непаспяховай эпідэмічнай сітуацыяй.

У краіне зніжаецца колькасць няшчасных выпадкаў на вытворчасці.

Грамадска-палітычнае выданне «Народная газета», якое існуе ўжо амаль 25 гадоў, з ліпеня 2014 года мяняе канцэпцыю і будзе выходзіць у фармаце 64-старонкавага ілюстраванага штотыднёвіка з тэматычнымі дадаткамі.

Тры медалі (адзін залаты і два бронзавыя) здолелі заваяваць беларускія спартсменкі на прадстаўнічых міжнародных спаборніцтвах Грын-пры Іспаніі па вольнай барацьбе.

Летняя акцыя «Веласіпед за дзякуй!» стартуе ў Мінску 11 ліпеня. З гэтага дня на цэнтральных праспектах Мінска размесцяцца пункты пракату, на якіх штодзённа з 10.00 да 22.00 пры наяўнасці пашпарта можна будзе бясплатна ўзяць веласіпед.

■ Праз час і адлегласць

ДЫПЛАМАТЫЯ СТАРЫХ ПАШТОВАК

Праектам «У пошуках страчанага» Уладзімір Ліхадзедаў сумесна з газетай «СБ. Беларусь сегодня» і Выдавецкім домам «Звязда» прэзентавалі нашу краіну ў ЗША

Гісторыя і культура не маюць межаў. Вельмі часта народы і краіны аказваюцца блізкімі праз лёсы адных і тых жа людзей, праз агульныя і аднолькава зразумелыя ўсім падзеі. Адчувалася гэта і на прэзентацыях, сустрэчах, якія пры падтрымцы беларускага пасольства ў ЗША правёў калекцыянер і гісторык, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзімір Ліхадзедаў. Фактычна ў ЗША прайшло своеасаблівае падарожжа праекта «У пошуках страчанага».

— А пачалося ўсё з урачыстага сходу, прысвечанага 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у Нью-Ёрку, — расказвае Уладзімір Аляксеевіч. — Больш за 200 чалавек сабралася, каб успомніць пра вайну, пагаварыць пра Беларусь. Рэпрадукцыі старых паштовак аказаліся якраз да месца. Трэба было бачыць твары землякоў, якія шукалі ў філакартычных альбомах свае гарады і вёскі.

СТАР. 5

Фота Уладзіміра АЛЯКСЕЕВА.

ISSN 1990 - 763X

14126

■ Парламенцкі дзённік

ДОБРЫ ЗАКОН ІНВЕСТЫЦЫЯМ НЕ ПАШКОДЗІЦЬ

ВІЗІТ ПАРЛАМЕНЦКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ КНР

Учора ніжнюю палату беларускага парламента наведала кітайская дэлегацыя на чале са старшынёй Камітэта па замежных справах Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў спадарыняй ФУ ІН.

— Мы, беларусы, заўсёды з вялікай радасцю сочым за тым, як развіваецца Кітайская Народная Рэспубліка, і я павінен сказаць, што Кітай за апошнія 20 з невялікімі гадоў з краіны, у якой усё ж было вельмі шмат праблем, ператварыўся ў адну з сусветных дзяржаў, — вітаў гасцей **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.** — Гэта стала магчымым дзякуючы, перш за ўсё, вялікай працавітасці кітайскага народа, яго таленту, еднасці. І мы, безумоўна, упэўнены ў тым, што ў нашым свеце за Кітаем вялікая будучыня. Што тычыцца беларуска-кітайскіх узаемаадносін, то іх асновай з'яўляецца сяброўства, узаемапаразуменне, падтрымка і еднасць.

Уладзімір Андрэйчанка таксама выказаў пажаданне, каб міжпарламенцкае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Кітаем развівалася па ўзыходзячай.

— Мэта нашага візіту — развіццё сяброўскіх адносін, — заўважыла, у сваю чаргу, Фу Ін. — Мы хацелі б пачуць пажаданні па далейшым супрацоўніцтве, меркаванне пра міжнародную сітуацыю, а таксама даведацца, як у якасці парламентарыяў можам паўплываць на развіццё гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння паміж нашымі краінамі.

Напярэдадні прыезду ў Беларусь кітайскія дэпутаты запрасілі на спецыяльны форум усіх кіраўнікоў кітайскіх прадпрыемстваў, якія працуюць у Беларусі, каб выслухаць іх прапановы. «Ёсць інтарэс і шмат магчымасцяў для рэалізацыі тых або іншых праектаў, — заўважыла старшыня Камітэта па замежных справах кітайскага парламента. — Але ўсё ж нам неабходна аптымізаваць работу яшчэ больш».

На запрашэнне ад імя Старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Чжана Дэцзяна Уладзімір Андрэйчанка адказаў, што разам са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Анатолем Рубінавым абмяркуе магчымасць такога візіту.

Кітайская парламенцкая дэлегацыя ў гэтыя дні таксама сустракаецца з прадстаўнікамі Міністэрства эканомікі Беларусі.

Паміж Беларуссю і Кітаем ажыццяўляецца актыўны міжпарламенцкі дыялог. Дагаворная база ўключае мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Усекітайскім сходам народных прадстаўнікоў КНР. Дзейнічаюць дэпутацкія групы па міжпарламенцкім супрацоўніцтве.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Віктар ГУМІНСКІ:

«ЗНАЧНАЯ ДЛЯ НАС ПЕРАМОГА»

РАСПРАЦАВАНАЯ БЕЛАРУСКІМІ ПАРЛАМЕНТАРЫЯМІ ПАСТАНОВА ЎВАЙШЛА Ў ТЭКСТ ВЫНІКОВАГА ДАКУМЕНТА ПА АБСЕ

Дэлегацыя беларускага парламента на чале з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Віктарам ГУМІНСКІМ прыняла ўдзел у працы 23-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, якая прайшла ў сталіцы Азербайджана Баку.

Беларускія парламентарыі прынялі актыўны ўдзел у працы агульных камітэтаў ПА АБСЕ па палітычных пытаннях і бяспецы, па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіях і навакольным асяроддзі, па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і гуманітарных пытаннях.

Кіраўнік беларускай дэлегацыі сустрэўся са старшынёй Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Сяргеем Нарышкіным, а таксама з дзеючым на той момант старшынёй ПА АБСЕ, старшынёй парламента Чарнагорыі Ранка Крывакапічам. Былі абмеркаваны пытанні парадку дня і міжпарламенцкага ўзаемадзеяння.

Адбылася таксама сустрэча намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў з Крыстаферам Смітам са Злучаных Штатаў Амерыкі, спецыяльным прадстаўніком ПА АБСЕ па пытаннях гандлю людзьмі. Амерыканскі кангрэсмен выказаў падзяку беларускім парламентарыям за падтрымку падрыхтаванага ім праекта рэзалюцыі «Прадухіленне гандлю дзецьмі з мэтай сексуальнай эксплуатацыі і судовае праследаванне за яго».

Падчас сустрэчы Віктара Гумінскага з кіраўніком дэлегацыі Вярхоўнай Рады Украіны ў ПА АБСЕ Алегам Зарубінскім была абмеркавана сённяшняя сітуацыя ва Украіне і шляхі выхаду з крызісу.

— Пытанне па падзеях ва Украіне стаяла вельмі сур'ёзна, — паведаміў «Звяздзе» Віктар Гумінскі. — Нягледзячы на ўсе спробы расійскага боку супрацьдзеяння антырасійскай рэзалюцыі, якую прапанавалі амерыканцы, нягледзячы на тое, што многія пагаджаліся з неабходнасцю весці дыялог і адмоўнай роляй гэтай рэзалюцыі, яна, на жаль, была прынята.

Таксама Віктар Гумінскі прадставіў на пасяджэнні агульнага камітэта Парламенцкай асамблеі АБСЕ па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіях і навакольным асяроддзі падрыхтаваную беларускім бокам рэзалюцыю «Абарона і прасоўванне сацыяльна-эканамічных правоў у рэгіёне АБСЕ». Дакумент накіраваны на прыцягненне ўвагі да праблемы сацыяльна-эканамічных правоў і наданне дадатковага імпульсу дзейнасці АБСЕ ў гэтай галіне. Рэзалюцыя была аднагалосна прынята ўдзельнікамі пасяджэння. Яна ўвайшла ў склад Бакінскай дэкларацыі, якая, у сваю чаргу, была прынята на заключным пасяджэнні штогадовай сесіі ПА АБСЕ.

— Калі мы прапанавалі такую рэзалюцыю, то патрапілі ў цэль, — расказаў Віктар Гумінскі. — Для таго, каб яна была разгледжана, мы сабралі 27 галасоў з 17 дзяржаў (патрабуецца 20 галасоў з 5 дзяржаў). Гэта значная для нас перамога. Акрамя таго, мы выступілі на ўсіх трох камітэтах, унеслі шэраг паправак, больш за палову з якіх былі прыняты.

Кіраўнік беларускай дэлегацыі таксама адзначыў, што на гэты раз ні на адным з камітэтаў, ні на пленарным пасяджэнні не было выступленняў, накіраваных супраць Беларусі ў тым або іншым пытанні.

— Калі не лічыць дзве папраўкі, якія ўнёс кіраўнік працоўнай групы па Беларусі Крысціян Хольм, шведскі дэпутат. Але яго неканструктыўная пазіцыя нам здаўна вядомая, — удакладніў віцэ-спікер ніжняй палаты беларускага парламента. — І нягледзячы на тое, што мы былі супраць гэтых паправак (размова ішла пра палітычных вязняў і пра павольнае разгортванне дэмакратычных грамадзянскіх інстытутаў у Беларусі), яны ўвайшлі ў склад рэзалюцыі, за якія мы не галасавалі.

Беларускія парламентарыі таксама адмовіліся ад прапанаванай спадаром Хольмам сустрэчы з Працоўнай групай па Беларусі, бо не ўбачылі, як выказаўся Віктар Гумінскі, канструктыўных крокаў з боку кіраўніка гэтай групы.

Дэлегацыя Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь правяла шэраг двухбаковых сустрэч з кіраўнікамі і членамі парламенцкіх дэлегацый дзяржаў — удзельніц АБСЕ, у тым ліку з краін СНД, а таксама Аўстрыі, Ісландыі, Італіі, Літвы, Нідэрландаў, ЗША, Турцыі, Фінляндыі, Францыі, Чарнагорыі, Чэхіі.

— Удзел у такіх сур'ёзных форумах дазваляе выбудоўваць далейшае супрацоўніцтва, — сказаў намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. — Па-першае, мы працуем на імідж краіны, бо вельмі актыўна выступаем на сесіях па ўсіх пытаннях, і гэта не застаецца не заўважаным. Па-другое, мы абмяркоўваем з калегамі з іншых краін кірункі далейшага ўзаемадзеяння і паміж парламентамі, і ў гандлёва-эканамічнай сферы.

У Баку быў абраны новы старшыня Парламенцкай асамблеі АБСЕ — Ілка Канерва (Фінляндыя), які ўзначаліць сесію ў наступным годзе.

Надзея ЮШКЕВІЧ, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■ Лічбы сведчаць

МЫ — НЕ ТАКІЯ ЎЖО І МАЛЕНЬКІЯ

Самыя свежыя факты пра нашу краіну

Наша краіна па колькасці насельніцтва займае 16-е месца сярод еўрапейскіх дзяржаў (увогуле ў Еўропе 65 краін), 5-е месца сярод краін СНД і 92-е месца ў свеце — пра гэта «Звяздзе» паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Калі ж параўноўваць тэрыторыі, то наша рэспубліка знаходзіцца на 13-м месцы сярод еўрапейскіх дзяржаў (трохі саступае Вялікабрытаніі і Румыніі, больш чым у 2,2 раза пераўзыходзіць Партугалію і Венгрыю і амаль у 5 разоў — Нідэрланды і Данію), на 6-м — сярод краін СНД (пасля Расіі, Казахстана, Украіны, Узбекістана, Туркменістана) і на 84-м месцы ў свеце.

Самая шматлікая па колькасці насельніцтва сярод абласцей рэспублікі — Гомельская вобласць (1 425,6 тыс. чалавек), а сярод раёнаў — Барысаўскі раён Мінскай вобласці (183,7 тыс. чалавек).

Урбанізацыя хуткімі тэмпамі

Тры чвэрці насельніцтва ў нас — гараджане. На пачатак 2014 года колькасць гараджан склала 7 млн 275 тыс. чалавек (для параўнання: усяго ў краіне пражываюць 9 млн 468 тыс. чалавек).

Каля 70% гарадскога насельніцтва засяроджана ў 14 гарадах Беларусі, у якіх колькасць насельніцтва перавышае 100 тыс. чалавек. Так, на пачатак 2014 года ў Мінску налічвалася 1 млн 922 тыс. жыхароў, у Гомелі — 512 тыс., у Магілёве — 371 тыс., у Віцебску — 363 тыс., у Гродне — 357 тыс., у Брэсце — 331 тыс., у Бабруйску — 218 тыс., у Баранавічах — 177 тыс., у Барысаве — 145 тыс., у Пінску — 136 тыс., у Оршы — 117 тыс., у Мазыры — 112 тыс., у Салігорску — 105 тыс., у Наваполацку — 102 тыс. чалавек.

Колькі хлопцаў на 10 дзяўчат?

У Белстаце сцвярджаюць, што на 1000 мужчын прыпадае 1151 жанчына. У гарадской мясцовасці гэтыя суадносіны склалі 1166 жанчын, у сельскай мясцовасці — 1102 жанчыны на 1000 мужчын. Усяго ў краіне на пачатак гэтага года пражывалі 5 066,9 тыс. жанчын і 4 401,3 тыс. мужчын.

Няўхільна старэем

Сярэдні ўзрост беларуса здаецца на першы погляд такім, што хочацца сказаць: «у самым росквіце сіл». А менавіта — 39,9 года. Пры гэтым сярэдні ўзрост мужчыны — 37,1 года, жанчыны — 42,3 года. Але, пачынаючы з 1990 года, сярэдні ўзрост пастаянна павялічваецца. Так, за апошнія 13 гадоў жыхар нашай рэспублікі «пасталеў» на 4,8 года, пры гэтым мужчына — на 4,5 года, жанчына — на 4,9 года.

На пачатак 2014 года насельніцтва ў працаздольным узросце налічвалася ў нас быццам бы не так ужо і мала — 5,6 млн чалавек (або 59,4% ад агульнай колькасці насельніцтва).

Колькасць насельніцтва Беларусі на пачатак 2014 года склала 9 млн 468 тыс. чалавек, павялічыўшыся ўпершыню за апошнія 20 гадоў.

Пры гэтым колькасць дзяцей і падлеткаў (0–15 гадоў) склала 1,6 млн чалавек (16,7% ад агульнай колькасці насельніцтва) і за 2013 год павялічылася на 31,4 тыс. чалавек.

Фота БЕЛТА.

Але няўхільна расце доля пажылых людзей, колькасць якіх на пачатак года склала больш за 2 млн чалавек, павялічыўшыся за мінулы год на 36,9 тысячы.

І ўсё ж, чаму ААН называе беларусаў старой нацыяй? Бо, у адпаведнасці са шкалой ААН, насельніцтва лічыцца маладым, калі доля асоб ва ўзросце 65 гадоў і старэй складае менш за 4%, на парозе старасці — ад 4% да 7%; калі ж доля асоб 65 гадоў і старэй роўная 7% і больш, то насельніцтва можна назваць старым. А ў Беларусі на пачатак гэтага года доля асоб ва ўзросце 65 гадоў і старэй складала аж 13,9%!

Дарэчы, самым «маладым» рэгіёнам Беларусі дэмографы называюць Мінск, сярэдні ўзрост насельніцтва якога склаў 38,2 года. Самым «старым» — Віцебскую вобласць (41,3 года).

Даўжэй за ўсіх жывуць гараджанкі

Чаканая працягласць жыцця для тых, хто нарадзіўся ў 2013 годзе, складае 72,6 года: для мужчын — 67,3 года, для жанчын — 77,9.

У цэлым розніца ў чаканай працягласці жыцця паміж мужчынамі і жанчынамі ў нашай краіне складае 10,6 года — на карысць жанчын, у працягласці жыцця гарадскога і сельскага насельніцтва 5 гадоў — на карысць горада. На сёння працягласць жыцця мужчын і жанчын у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу большая, чым у сельскіх населеных пунктах: у мужчын — на 5,3 года, жанчын — на 3,2 года.

Святлана БУСЬКО

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ДЭПАЗІТЫ ЗНОЎ «ПАДРЭЗАЛІ»

З першых дзён ліпеня ўжо другі раз за лета памяншаюцца ў Беларусбанку працэнтныя стаўкі па новых тэрміновых банкаўскіх укладах (дэпазітах) фізічных асоб у беларускіх рублях.

Цяпер дэпазіт «Прыярытэт» прапануецца кліентам пад 31,5% гадавых, «Гарантаваны даход» тэрмінам на 15 дзён — пад 18% гадавых, а тэрмінам на 35 дзён — пад 27,5% гадавых.

Асноўны даход банкаўскага ўкладу «Інтэрнэт-дэпазіт-Прэзент» вызначаны ў памеры 31,5% гадавых, а асноўныя працэнты дэпазіта «Чатыры сезоны» — у памеры 32% гадавых. Самы вялікі асноўны даход у памеры 34,5% гадавых прапануецца па ўкладах «Інтэрнэт-дэпазіт». Новыя ашчадныя сертыфікаты з тэрмінам абарачэння 1 месяц афармляюцца ў ліпені пад 28,5% гадавых, на 2 месяцы — пад 29,5% гадавых. Такім чынам, працэнтныя стаўкі па дэпазітах у буйнейшым банку краіны паменшыліся яшчэ прыкладна на 1–2%.

Сяргей КУРКАЧ.

ПАСАЖЫРЫ ВЫБІРАЮЦЬ ЦЯГНІКІ ГАРАДСКІХ ЛІНІЙ

У першым паўгоддзі назіралася ўстойлівая тэндэнцыя росту папулярнасці цягнікоў гарадскіх ліній, паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі.

Згодна з папярэдняй інфармацыяй, за паўгода імі было перавезена 1,1 мільёна пасажыраў, што складае 123,2 працэнта да ўзроўню аналагічнага перыяду летась.

Чатырохвагонныя цягнікі гарадскіх ліній сталі першым сучасным рухомым саставам, які быў уведзены Беларускай чыгункай у рамках новага фармату пасажырскіх перавозак. Сёння курсіруюць шэсць такіх цягнікоў па маршрутах Мінск — Беларусь (Заслаўе) і Мінск — Рудзенск. Усяго, пачынаючы з адкрыцця руху цягнікоў гарадскіх ліній у 2011 годзе, і па сёння імі перавезена 5 мільёнаў пасажыраў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАНТРАБАНДНЫ «АРФЕЙ»

Супрацоўнікі Віцебскай мытні канфіскавалі антыкварыят і дзве карціны агульным коштам больш за 359,4 мільёна рублёў.

У аўтамабілі «Вольва», на якім везлі антыкварыят, мытнікі знайшлі прадметы, якія не былі заяўлены ў адпаведных суправаджальных дакументах. Часткі мэблі, мармуровыя стальніцы, свяцільні і г. д. былі канфіскаваны. Сярод іншага былі і дзве карціны вядомага мастака Харашылава, які жыве ў Лондане.

Як растлумачылі ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, мастак напісаў карціны «Арфей» і «Арфей і Эўрыка» для парыжскага заказчыка. Кожная з карцін была аплачаная — па 4560 фунтаў стэрлінгаў. Карціны ў яго не кралі. Чаму падчас перавозкі іх не ўнеслі ў спіс, пытанне застаецца адкрытым.

— Краязнаўчы музей прызнаў, што названыя прадметы ўяўляюць мастацкую і гістарычную каштоўнасць. Пасля прыняцця судом канчатковага рашэння яны могуць быць канфіскаваны ў даход дзяржавы, — дадалі ў мытным ведамстве.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.

100 БАЗАВЫХ ЗА ЛОМ

У Магілёўскім раёне канфіскавана буйная партыя каляровага металу.

Падазроны грузавы аўтамабіль быў затрыманы супрацоўнікамі фінансавай міліцыі каля вёскі Кадзіна. Згодна з дакументамі, 29-гадовы вадзіцель перавозіў з Магілёва ў Маскву мінеральную вату. Але за цюкамі з ватай кантралёры знайшлі 17,5 тоны каляровага і чорнага металу.

— Кіроўца ўжо неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за падобныя парушэнні, — адзначыў **намеснік начальніка ўпраўлення ДФР КДК па Магілёўскай вобласці Аляксандр ШАРОЙКІН.** — Метал, які ён спрабаваў вывезці на гэты раз, з'яўляецца прамысловым і ацэньваецца прыкладна ў 140 мільёнаў рублёў. Дарэчы, на тое, каб нарыхтаваць гэты аб'ём, яму спатрэбіўся ўсяго месяц. Яго чакае штраф да 100 базавых велічынь з канфіскацыяй каштоўнага грузу. Не выключаецца і крымінальная адказнасць.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

по объекту «12-этажный жилой дом со встроенными помещениями № 31 (по генплану) в микрорайоне Малиновка-6. Встроенные помещения»,

опубликованную в газете «Звязда» № 81 за 03.05.2014

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается:

- 1 (одна) однокомнатная квартира общей площадью 46,48 кв.м на 1-ом этаже жилого дома стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **1 300 долларов США** по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день оплаты.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованной ранее.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, ул. Короля, 20, к. 2, тел. (017)200-06-85, (044)795-44-44.

УНП 190579681

СОАО «Минский завод автомобильной комплектации»

ОБЪЯВЛЯЕТ ТЕНДЕР

НА ПРОВЕДЕНИЕ ПРОЕКТНО-ИЗЫСКАТЕЛЬСКИХ РАБОТ И ВЫПОЛНЕНИЕ СТРОИТЕЛЬНО-МОНТАЖНЫХ РАБОТ ПО ОБЪЕКТУ: «Устройство дополнительного въезда с территории завода с благоустройством земельного участка, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Михася Лынькова, 123».

УНН 190050257

Предложения принимаются в течение 5 дней со дня публикации по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 123.

Тел./факс 205-86-00, тел. 205-85-26. *Тельтевский В.Н.*

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 5» (г. Минск, ул. Широкая, 26) извещает о проведении 21 июля 2014 года в 11 часов 00 минут ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ по адресу: г. Минск, ул. Широкая, 26 (актовый зал).

Форма проведения собрания: очная.

Инициатор созыва: наблюдательный совет.

Основание созыва: решение наблюдательного совета.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О выплате дивидендов по результатам деятельности Общества за I-II кварталы 2014 года.

С материалами собрания можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Широкая, 26, отдел механизации и энергетики, по рабочим дням с 10 июля 2014 года по 18 июля 2014 года с 8^{00} до 17^{00}, (понедельник–четверг) и с 8^{00} до 15^{45}-(пятница) либо 21 июля 2014 года по месту проведения собрания, тел. для справок (017) 281 24 27.

Регистрация акционеров (их представителей), прибывших на собрание, состоится 21 июля 2014 года с 09^{30} до 10^{45} по месту проведения собрания. При себе иметь паспорт, представителю акционера иметь паспорт и доверенность акционера или договор.

УНП 100219908 ***Наблюдательный совет ОАО «ДСТ № 5»***

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Коммунальное унитарное дочернее предприятие

«Управление капитального строительства Фрунзенского района г. Минска»

(в дополнение к ранее опубликованной в газете «Звязда» от 28.05.2014 года)

Застройщик – Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 № 190580553.

Место нахождения: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й, Загородный, пер. 64а.

Тел./факс: 204-67-99, 399-53-94.

Режим работы – 8.45 – 18.00, обед 13.00 – 14.00; пятница 8.45–16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.

Информация о проекте.

Объект «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева в г. Минске. Микрорайон № 3 (2-ая очередь строительства). Жилой дом № 23 по генплану» расположен во Фрунзенском районе г. Минска.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, **1 трехкомнатная квартира общей площадью 92,94 кв.м.**

Цена 1 кв.м общей площади квартиры в жилом доме № 23 по генплану на дату опубликования проектной декларации сформирована в текущем уровне цен с учетом прогнозных индексов по состоянию на апрель 2014 года и составляет **11 682 200 белорусских рублей.**

Начало строительства – октябрь 2013 года.

Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию – 30 сентября 2014 года.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;

- быть готовым оплатить в течение 3 рабочих (банковских) дней с даты регистрации договора в комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома 25 процентов стоимости объекта долевого строительства.

УНП 190580553

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Информация о застройщике:

«Приорбанк» Открытое акционерное общество, юридический адрес и местонахождение: 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А. Зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 12.07.1991 г., регистрационный № 12.

Режим работы: понедельник–четверг с 8^{30} до 17^{30} часов, пятница с 8^{30} до 16^{15} часов, обед с 12 ^{30} до 13 ^{15} часов, выходные дни – суббота, воскресенье, государственные праздники и праздничные дни.

Застройщиком получены:

- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков и возникновения права на него от 28.03.2013 № 500/1109-4607; от 28.03.2013 № 500/1109-4608; от 28.03.2013 № 500/1109-4609; от 28.03.2013 № 500/1109-4610; от 01.04.2013 № 500/1109-4622;

- решение Мингорисполкома от 31.01.2013 № 147 «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменений в решения Мингорисполкома»;

- решение Мингорисполкома от 14.02.2013 № 341 «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и о внесении изменений в решения Мингорисполкома»;

- решение Мингорисполкома от 28.02.2013 № 457 «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства»;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «Госстройэкспертиза по г.Минску» от 16.11.2009 № 1762-5/09 и от 02.03.2012 № 55-15/12;

- приказ «Приорбанк» ОАО об утверждении проектно-сметной документации от 03.05.2012 № 114;

- разрешение на организацию строительно-монтажных работ от 13.06.2013 № 2-207Ж-014/13, выданное инспекцией департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску;

- договор строительного подряда № 107 от 28.03.2013;

Информация о проекте:

Наименование проекта: Строительство группы жилых домов неповышенной комфортности в квартале улиц Корш-Саблина — Л. Беды — Белинского — Восточной». Дом № 2 по генплану (I очередь строительства).

Местонахождение объекта: Объект находится в Советском районе города Минска в квартале улиц Корш-Саблина — Л. Беды — Белинского — Восточной.

Цель проекта строительства: строительство двадцатиэтажного жилого дома.

Характеристика объекта:

Жилой дом №2 по генплану – односекционное 20-этажное здание. Наружные стены из ячеистых блоков толщиной 400мм, внутренние несущие монолитные стены толщиной 160мм и монолитные плоские перекрытия толщиной 200мм. Внутриквартирные перегородки из стеновых блоков ячеистого бетона толщиной 100мм.

На первом этаже располагаются помещение товарищества собственников, комнаты консьержа, кладовая уборочного инвентаря, электрощитовая, помещение для локальной вычислительной сети и кабельного телевидения.

Общее число квартир 118, в том числе:

- однокомнатные — 39 шт.;
- двухкомнатные — 40 шт.;
- трехкомнатные — 38 шт.;
- четырехкомнатная – 1 шт.

Общая площадь квартир:

Однокомнатных от 52.36 до 61.72 м кв.;

Двухкомнатных от 67.52 до 79.30 м.кв.;

Трехкомнатных от 87.01 до 90.96 м кв.;

Четырехкомнатной 125.85 м.кв.

Дом оборудован лифтами, мусоропроводом. Кровля плоская с внутренним водостоком. Окна – из ПВХ профиля с двухкамерными стеклопакетами. Остекление лоджий – из алюминиевого профиля со стеклом.

В жилом доме предусмотрена установка пожарных автономных извещателей;

- Вентиляция – естественная;

- Электроснабжение – поквартирная разводка электропроводки с установкой электросчетчиков;

- Холодное и горячее водоснабжение – стояки с приборами учета, установка и подключение унитаза, выводы для кухни и ванны;

Отопление – двухтрубная система отопления с установкой радиаторов и счетчиков учета тепла для каждой квартиры;

Телефонизация, радиофикация, телевидение – поквартирная разводка.

Внутренняя отделка только мест общего пользования (общие коридоры, лифтовые, лестничные пролеты, входные группы).

Внутренняя отделка жилых помещений:

стены, потолки, полы — без чистовой отделки.

Дверные блоки:

наружные – металлические;

межквартирные – деревянные;

межкомнатные – не устанавливаются.

После завершения строительно-монтажных работ на прилегающей территории будет выполнено благоустройство и озеленение.

Сроки строительства:

Начало – 15 апреля 2013 г.

Окончание – 31 декабря 2014 г.

Заключение договоров долевого строительства:

Договора долевого строительства заключаются на следующие квартиры:

Квартира	Количество
Однокомнатные	5
Двухкомнатные	5
Трехкомнатные	5

Прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться через 7 календарных дней после опубликования проектной декларации по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 41, пом. 204, ЧРУП «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс». Прием заявлений осуществляется до момента набора их необходимого количества. Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и «Приорбанк» ОАО вправе заключить договор с другим претендентом.

Цена объектов долевого строительства

Формирование стоимости метра квадратного производится на основании сводного сметного расчета с учетом затрат застройщика.

Стоимость строительства квартиры составляет 1 600 (одна тысяча шестьсот) долларов США за один метр квадратный.

Изменение цены объекта долевого строительства производится в одностороннем порядке по инициативе Застройщика в связи с определением фактической площади объекта долевого строительства по результатам технической инвентаризации РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Условия заключения договоров долевого строительства

1. При заключении договора участник долевого строительства вправе выбрать квартиру соответствующей площади из имеющихся свободных квартир, предложенных застройщиком для заключения договоров на момент заключения договора.

2. Первоначальный взнос для всех категорий участников долевого строительства составляет не менее 30% от стоимости квартиры (цены договора) и должен быть внесен не позднее 1 месяца с момента заключения договора долевого строительства.

3. Скидки для всех категорий граждан, заключающих договоры долевого строительства, составляют:

- при единовременном внесении 100% стоимости квартиры (цены договора) в течении 1 месяца с момента заключения договора для всех категорий участников долевого строительства стоимость 1 квадратного метра составляет – 1 550 долларов США.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после его ввода в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и вентиляционные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие конструкции, сантехническое, электрическое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их деятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в собственность Дольщиков, если финансирование этих объектов осуществлялось Дольщиками, и передаются Застройщиком товариществу собственников.

Срок действия декларации – до опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованной ранее.

Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить в ЧУП «АН «Риэлт-Экспресс», по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 41, пом. 204, ЧРУП «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс» или по телефону: 8 (017) 292-42-19.

■ Абітурыент-2014

Аляксандр ЖУК:

«Чакаем павышэння прахадных балаў у педагагічным універсітэце»

«Кожны студэнт-першакурснік нашай ВНУ будзе забяспечаны месцам у інтэрнаце», — паабяцаў падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М.Танка Аляксандр ЖУК.

Фота БЕЛТА.

Як вядома, сёлета магчымасць паступаць на педагагічныя спецыяльнасці без экзаменаў атрымалі школьныя медалісты, уладальнікі дыпломаў ССНУ з адзнакай і прызёры абласных этапаў рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах. Усяго ў гэты пералік увайшлі 22 спецыяльнасці. Але галоўнай інтрыгай застаецца пытанне: ці многія з выдатнікаў скарыстаюцца прадастаўленай ім прывілеяй і зробяць свой выбар на карысць педагогікі? Аляксандр Жук настроены вельмі аптымістычна:

— Мы папрасілі спісы ўсіх медалістаў з Мінска і Мінскай вобласці і ўсім ім накіравалі лісты ў школы. Нашы запрашальныя лісты былі агучаны на апошніх званках. У сацыяльных сетках створаны групы БДПУ, якія рэгіструюць пытанні, што тычацца ўступнай кампаніі. Абітурыенты з кола медалістаў і прызёраў алімпіяды ўжо тэлефанавалі ва ўніверсітэт, цікавіліся ўмовамі прыёму.

МІЖНАРОДНЫ ІМІДЖ І АКАДЭМІЧНАЯ МАБІЛЬНАСЦЬ

На думку Аляксандра Жука, прадастаўленне студэнтам месца ў інтэрнаце — хоць і вельмі важны, але далёка не адзіны аргумент на карысць выбару месца навучання. У БДПУ ў будучых педагогаў ёсць магчымасць рэалізоўваць свой патэнцыял не толькі ў адукацыйнай сферы. Напрыклад, ва ўніверсітэце ёсць шмат спартыўных клубаў. Каманды ўніверсітэта з'яўляюцца прызёрамі і пераможцамі рэспубліканскай універсіяды па розных відах спорту: па футболе, футзале, барацьбе. Таксама ва ўніверсітэце дзейнічаюць шмат творчых калектываў.

— Адна з нашых задач — павышэнне міжнароднага іміджу ўніверсітэта, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Сёння БДПУ мае дагаворы аб супрацоўніцтве з больш чым 60 ВНУ як блізкага, так і далёкага замежжа. Напрыклад, заключаны дагавор аб супрацоўніцтве з Флярэнтыйскім універсітэтам. Па-першае, ён мае на ўвазе арганізацыю моўных курсаў. Студэнты БДПУ, якія вывучаюць італьянскую мову, будуць выязджаць для праходжання навучання ў Італію. Такая магчымасць з'явіцца ў іх ужо на зімовых канікулах, а ў наступным годзе — падчас летніх канікул. Мы дамовіліся з гэтым універсітэтам таксама пра так званае «ўключанае навучанне». Гэта значыць, што нашы студэнты будуць выязджаць у Італію на семестр або на ўвесь навучальны год для засваення праграм, узгодненых паміж дзвюма ВНУ. Адпаведна, будзем чакаць у Беларусі будучых псіхолагаў і сацыяльных работнікаў, якіх рыхтуе Флярэнтыйскі ўніверсітэт.

Акрамя таго, з дапамогай італьянскай асацыяцыі «Пуэр», якая займаецца аздараўленнем беларускіх дзяцей пасля чарнобыльскай аварыі, у нас будзе арганізаваны цэнтр псіхалагічнага кансультавання сем'яў, якія ўсынавілі дзяцей. Кансультацыі змогуць атрымаць і бацькі, і дзеці. Мы дамовіліся, што выкладчыкі і студэнты БДПУ, якія будуць працаваць на валанцёрскай аснове ў цэнтры, змогуць летам выязджаць з групамі дзяцей на аздараўленне. Там яны будуць сумяшчаць работу і адпачынак, выступаючы ў якасці псіхолагаў-кансультантаў.

Акрамя таго, у педагагічным універсітэце рэалізуецца праграма Erasmus+. Мы ставім задачу па пашырэнні магчымасцяў для праходжання стажыровак і навучання ў замежных універсітэтах, павялічваючы акадэмічную мабільнасць нашых студэнтаў і выкладчыкаў.

ПРАФАРЫЕНТАЦЫЯ ЗА ШКОЛЬНАЙ ПАРТАЙ

Адказваючы на пытанне, з якімі баламі ўніверсітэт хацеў бы бачыць абітурыентаў у гэтым годзе, рэктар БДПУ патлумачыў сваю пазіцыю:

— Справа не ў абсалютных балах. Хацелася б (і такую задачу я паставіў перад калектывам), каб у гэтым годзе прахадны бал ва ўніверсітэт быў прыкладна на 10-30 пунктаў вышэйшы за мінулагодні. Уся Мінская вобласць у нас разбіта на сектары, нашы факультэты працуюць са школамі. Я сустракаўся з начальнікамі раённых аддзелаў адукацыі, спорту і турызму Мінскай вобласці: 18 з 23 — нашы выпускнікі. У Мінску таксама большасць начальнікаў упраўленняў — нашы выпускнікі. У верасні мы сумесна з упраўленнем адукацыі Мінскай вобласці і сталічным Камітэтам па адукацыі плануем абмеркаваць вынікі ўступнай кампаніі і арганізацыю прафарыентацыйнай работы на перспектыву. Заключым дагавор аб узаемадапамозе. Універсітэт прапануе школам дапамогу ў падрыхтоўцы да абласных, гарадскіх і раённых алімпіяд, арганізуе школы юных матэматыкаў, фізікаў і г.д. Будзем працаваць са школьнікамі, пачынаючы з сярэдніх класаў. Усё гэта робіцца для таго, каб на момант заканчэння школы мы мелі ўжо патэнцыяльных абітурыентаў.

■ Фестывалім

Чым здзівіць 23-ці «базар»?

Ёсць такая добрая традыцыя на фэсце — здзіўляць, не паўтарацца. Нагадаю, што летась міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» змяніў фармат. У прыватнасці, стаў менш працяглым па часе, не было нацыянальных дзён (Беларусі, Украіны і Расіі), змяніўся падыход да правядзення конкурсаў юных і маладых выканаўцаў.

«ЗОРКА» НАДЗЕІ БАБКІНАЙ

Сюрпрызам 23-га па ліку фестывалю мастацтваў стане цырымонія адкрыцця 10 ліпеня. Калі прапусціце тэлевізійную трансляцыю, потым не крыўдуйце самі на сябе. Відовішча, паверце старажылу «базару», будзе на ўзроўні самых вядомых і лепшых шоу свету. Убачыце насамрэч шыкоўнае, фантастычнае афармленне галоўнай сцэнічнай пляцоўкі — з 3D-эфектамі і фантанамі, якія будуць «акампаніраваць» музыцы...

У канцэрце возьмуць удзел Філіп Кіркораў, Стас Міхайлаў, Сяргей Юрскі, Пелагея, Надзея Кадышава і ансамбль «Залатое кальцо», Анастасія і Марыя Талмачовы, арт-групы «Хор Турэцкага», «Сапрана 10», групы «ПМ» і «Прэм'ер-міністр», а таксама Алёна Ланская, Тэа, Анатоль Ярмоленка і ансамбль «Сябры», Аляксандр Рыбак (Нарвегія), група «DSCHINGHIS KHAN» (Германія) і іншыя. У праграме і фартэпіяннае шоу «BEL SUONO», балет «STREET-JAZZ» і гэтак далей.

Адна з удзельніц канцэрта, Надзея Бабкіна, сёлета стала лаўрэатам спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення». Па традыцыі, на канцэрце адкрыцця фэсту адпаведны дыплом уручае асабіста кіраўнік нашай дзяржавы. На «Алеі зорак» цяпер будзе именная «зорка» гэтай пастаяннай удзельніцы «базару». Дарэчы, яна аж чатыры разы была членам журы конкурсу маладых выканаўцаў.

Між іншым, па новай фестывальнай традыцыі, на канцэрце адкрыцця фэсту адбудзецца прэзентацыя ўдзельнікаў конкурсаў спевакоў.

З ЦЫГАНСКАГА ШОУ НА ВІЦЕБСКІ ФЭСТ

Сёлета, дарэчы, зноў зменненні ў фармаце правядзення міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2014»: у фінал выйдуць самыя таленавітыя. Беларусь будзе прадстаўляць 23-гадовы Артур Міхайлаў. Хлопец нарадзіўся ў Маладзечне, на сцэне з 6 гадоў. Артур — лаўрэат розных конкурсаў, уладальнік Гран-пры XIV рэгіянальнага фестывалю-конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Адна зямля». Што цікава, малады спявак — член Беларускага грамадскага аб'яднання грэкаў «Пелапанес», бярэ ўдзел у фестывалях нацыянальных культур у Гродне. Ён — сапраўдны паліглот: выконвае песні на рускай, беларускай, грэчаскай, англійскай, французскай, сербскай, іспанскай мовах. Летась ён скончыў Інстытут сучасных ведаў імя Шырокава, дыпламаваны артыст эстрады. Вучыўся ў Пятра Ялфімава — калісьці, дарэчы, прызёра «Славянскага базару ў Віцебску». Яшчэ больш цікава, што хлопец — саліст цыганскага шоу «Алюр».

На XII Міжнародным дзіцячым музычным конкурсе «Віцебск-2014» выступяць дзве нашы дзяўчынкі з Мінска — 11 гадовыя Зінаіда Купрыяновіч і Мілана Рэдчанка. Нягледзячы на юны ўзрост, у іх творчай скарбонцы мноства перамог.

Будзем «хварэць» за нашых!

ШТО МОЖНА БУДЗЕ ЎБАЧЫЦЬ УПЕРШЫНЮ

Прадстаўленне «Парад усмешак» з удзелам папулярных гумарыстаў і праграма арт-групы «Хор Турэцкага» **8 ліпеня** сталі першымі канцэртамі ў Летнім амфітэатры — па-за афіцыйнай праграмай фэсту.

А што можна будзе ўбачыць упершыню? Новае «дзіця базару» — праект «Лялечны квартал». Санкт-Пецярбургскі тэатр «Лялечны фармат» на віцебскай сцэне пакажа спектакль «Русалка Света з вёскі Перамілава» і «Вершнік CUPRUM», Гродзенскі абласны тэатр лялек прэзентуе спектакль «Пікавая дама» па аднайменным творы Пушкіна... Гаспадары сцэны, віцебскія лялечнікі, падрыхтавалі для паказу спектаклі «Дэкамерон» — імправізацыя на тэмы Джавані Бакача (пастаноўка Віктара Клімчука) і «Брэменскія музыканты».

9 ліпеня будзе прэзентаваны конкурс-выстава работ студэнтаў мастацкіх спецыяльнасцяў вышэйшых навучальных устаноў «Арт-сесія». Конкурс праводзіцца ў Віцебску, пачынаючы з 1992 года. На ім прадстаўлены такія кірункі, як выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, графіці, жывапіс на асфальце, 3D-малюнкі.

Упершыню на фэсце і вечар сучаснай харэаграфіі. Віцебскі фестываль сучаснай харэаграфіі — старэйшы на тэрыторыі былога СССР і адзін з самых вядомых у свеце. Таму, безумоўна, на «базары» ён даўно заслужыў права быць прадстаўленым хаця б у скарочаным варыянце. Выступяць калектывы з Беларусі, Расіі і Украіны.

Фестываль афіцыйна скончыцца 14 ліпеня. Але зноў жа, па традыцыі, ён будзе працягвацца. **15 ліпеня** адбудзецца сольны канцэрт Алега Газманава, выступяць «зоркі» шансона.

На наступны дзень **(16 ліпеня)** запланаваны канцэрт «Рок сустракае оперу». Пад суправаджэнне прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкіна выступяць Георгій Калдун, Іван Вабішчэвіч, Пётр Ялфімаў, Аляксей Хлястоў, Наталі Баяра і іншыя. Апошнім канцэртам на фэсце стане «Рок-панарама» (выступіць легендарная група «Чайф»).

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Фота БЕЛТА.

Акрэдытацыі фестывалю атрымалі артысты Ангеліна Калачова, Ксенія Пятрова і Артур Сокал.

ВЫДАТНІКІ ВЫБІРАЮЦЬ ВЫСОКІЯ ТЭХНАЛОГІІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Выпускнік сярэдняй школы №7 горада Баранавічы Дзмітрый ІГНАТЧЫК на «выдатна» здаў тэсціраванні па беларускай мове і матэматыцы. Дарэчы, да абітурыенцкага «хет-трыка» хлопцу не хапіла зусім трохі: у трэцім тэсце па фізіцы ён дапусціў усяго адну памылку, якая панізіла адзнаку да 96. Сакрэт свайго поспеху Дзмітрый бачыць у добрай працы настаўнікаў, якія рыхтавалі яго да ЦТ:

— Да здачы тэсціравання я доўга і ўпарта рыхтаваўся. Больш за ўсё быў упэўнены ў матэматыцы, менш за ўсё — у мове. Матэматыка была маім любімым прадметам у школе. На працягу ўсяго перыяду навучання я ёй цікавіўся. Наша школьная настаўніца, Таццяна Машніна, дапамагла мне палюбіць гэты прадмет і адкрыць для сябе шмат новага. Увогуле, з дакладнымі навукамі ў мяне праблем не было. З мовай, якую ў любым выпадку прыйшлося б здаваць, складаней. Але, зноў-такі дзякуючы настаўніцы, якая пераканала мяне здаваць менавіта беларускую мову і падрыхтавала да тэсціравання, усё атрымалася цудоўна.

Зразумела, нават самыя лепшыя настаўнікі не дапамогуць вучню-абібоку і лайдаку. Кошт двух стабальных сертыфікатаў — сотні гадзін дадатковай працы, адсутнасць вольнага часу і грашовыя выдаткі. Акрамя рэпетытара па фізіцы, Дзмітрый 4 разы на тыдзень наведваў факультатывы па матэматыцы, а па суботах у школе дадаткова займаўся беларускай мовай. Яшчэ адзін складнік поспеху, на які звярнуў увагу хлопец, — удача. На трох тэсціраваннях яму трапляліся варыянты са знаёмымі заданнямі, якія ён умеў і любіў выконваць.

Паступаць хлопец збіраецца ў БДУІР, на спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» факультэта камп'ютарных сістэм і сетак. Такому выбару паспрыяў удзел Дзмітрыя ў тэматычнай змене дзіцячага лагера «Зубраня», падчас якой хлопец з'ездзіў на экскурсію ў Парк высокіх тэхналогій і ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. З таго часу ён і загарэўся марай працаваць у сферы ІТ.

— Цяпер я планую паспяхова скончыць сваё навучанне ва ўніверсітэце, стаць моцным спецыялістам і знайсці добрую працу, — кажа Дзмітрый. — Ну і наладзіць асабістае жыццё, вядома. Калі казаць пра нешта глабальнае, то я хацеў бы павандраваць па свеце. Бо на зямлі так шмат цікавых і незвычайных месцаў, што цэлага жыцця можа не хапіць, каб пабачыць усё.

❍ ❍ ❍

На факультэт камп'ютарных сістэм і сетак збіраецца паступаць і другі ўладальнік двух сертыфікатаў з максімальным балам — цяпер **мінчанін, а раней жыхар горада Горкі, выпускнік мінскай гімназіі №75 Мікіта ЛАТУШКІН.** Менавіта для адукацыі сына і дачкі Мікітавы бацькі тры гады таму з райцэнтра пераехалі жыць і працаваць у сталіцу. Відавочна, нездарма, бо сын чаканні сям'і ўжо апраўдвае.

У адрозненне ад папярэдняга героя, хлопец лічыць, што асноўным складнікам яго поспеху стала праца з рэпетытарамі. Мікіта персанальна займаўся з педагогамі па ўсіх трох прадметах: рускай мове, матэматыцы і фізіцы. Менавіта першае тэсціраванне па рускай мове стала для хлопца найгоршым:

— Тэст па рускай мове я, шчыра кажучы, «заваліў». Напэўна, сказалася расхалоджанасць і няўважлівасць: у некаторых заданнях замест членаў сказа пачаў вызначаць часціны мовы. Аб тым, што зрабіў усё няправільна, даведаўся ўвечары, калі з сябрам разбіраў тэст. Вядома, перапужаўся, бо калі б на гэтыя памылкі наклаліся якія-небудзь не заўважаныя мной, усё было б зусім дрэнна. Але вынік усё ж такі неблагі — 79. Такая крыўдная памылка на першым жа ЦТ моцна выбіла мяне з каляіны, але, напэўна, прастымулявала максімальна адказна паставіцца да астатніх.

Два другія тэсціраванні сталі для Мікіты выпрабаваннем. Хлопец расказвае, як не мог заснуць з-за стрэсу, а раніцай вельмі балелі вочы. Дрэнна спалася і яго бацькам. Тэсты па матэматыцы і фізіцы Мікіта выканаў за 80 і 100 хвілін адпаведна, але раней за вызначаны тэрмін па дамове з бацькамі з аўдыторыі не выходзіў — лішні раз правяраў і перачытваў, хоць і быў упэўнены абсалютна ва ўсіх адказах.

Вынік, безумоўна, задаволіў Мікіту і яго сям'ю, а таксама прынёс доўгачаканую палёгку. Цяпер хлопец плануе трохі адпачыць і... прыняцца за вывучэнне будучай спецыяльнасці самастойна.

— На маю думку, цэнтралізаванае тэсціраванне не дае максімальнай аб'ектыўнасці пры ацэнцы канкрэтнага чалавека, — дзеліцца думкамі Мікіта. — Тры гадзіны даецца для ўсіх, і не мае значэння, хутка ты ўсё зрабіў ці павольна. За час, які ў мяне заставаўся пасля напісання тэстаў, я мог паказаць, што ведаю і ўмею значна больш. Бо балаў мне мала і не хапіць. Напэўна, гэта галоўны недахоп тэсціравання, які я адчуў на сабе.

Планаваннем сваёй будучыні хлопец пакуль што не займаецца. Мікіта спадзяецца, што час, які ён правядзе ва ўніверсітэце, дазволіць яму не толькі атрымаць практычныя веды, а яшчэ і зарыентавацца ў сферы ІТ, каб потым займацца любімай працай і знайсці шчасце ў жыцці.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА і з асабістага архіва.

ПРАДАЕЦЦА СЯДЗІБА. ДОРАГА

«ВЫ ПАГЛЯДЗІЦЕ, ЯК ЯНА ВЫГЛЯДАЕ!»

Але на практыцы ўсё значна складаней. Па словах **начальніка аддзела па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Наталлі ХВІР,** у краіне ёсць як станоўчыя, так і адмоўныя прыклады аднаўлення гістарычных сядзіб.

— У якасці негатыўнага прыкладу можна прывесці сядзібу ў вёсцы Грымяча Камянецкага раёна, якую перадалі ў прыватную ўласнасць. Уладальнікі арганізацыі, якая набыла яе, думалі, што змогуць укласці ў яе мінімальныя сродкі і пасля перапрадаць аднаму італьянцу. Аднак яны не ўлічылі, што на сядзібу распаўсюджваецца заканадаўства ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, а значыць, проста касметычны рамонт там зрабіць нельга. Таму праз пэўны час сядзібу вярнулі на баланс аддзела культуры.

Асноўнымі прычынамі, па якіх сядзібы стаяць безгаспадарныя, з'яўляюцца недахоп фінансавых сродкаў для іх аднаўлення, а таксама распрацоўка адпаведнай дакументацыі, якая патрабуе немалых намаганняў. Акрамя таго, калі аб'ект гісторыка-культурнай спадчыны перадаецца ўласніку, той падпісвае ахоўныя абавязацельствы і бярэ на сябе адказнасць за яго. Вось і атрымліваецца, што з 46 сядзібна-паркавых комплексаў, зацверджаных для перадачы ўласнікам, перададзена толькі 9.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усе цікаўныя могуць азнаёміцца са спісам сядзіб на сайтах абласных і райвыканкамаў.

— Гэта сведчыць пра недастатковы ўзровень працы ў гэтым кірунку мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, — лічыць Наталля Хвір.

Зрэшты, часам для таго, каб прадухіліць разбурэнне будынка, неабходна проста абараніць яго ад дзеяння ападкаў, закансерваваць. Гэта не заўсёды патрабуе вялікіх фінансавых укладанняў — дастаткова можа быць нават кавалка руберойду.

Некаторыя спецыялісты прапануюць пайсці еўрапейскім шляхам ратавання беларускіх сядзіб. Напрыклад, перадаць іх грамадскім структурам — фондам, як у Германіі, стварыць камбінаваную падтрымку дзяржавы і прыватнікаў, як у Вялікабрытаніі, плаціць чалавеку-наглядчыку грошы за падтрыманне сядзібы, як у Каталоніі... Але, на думку Наталлі Хвір, выкарыстоўваць у Беларусі замежны вопыт захавання старадаўніх сядзіб не зусім карэктна, бо там «не было 80 гадоў СССР». Па словах начальніка аддзела, часта на балансе нябедных арганізацый знаходзяцца сядзібы ў непрывабным стане, на аднаўленне якіх не выдзяляецца ні капейкі.

— Толькі дзякуючы таму, што мы пачалі прымаць меры адміністрацыйнага характару, на адной з сядзіб перакрылі дах, аднак, у парушэнне патрабаванняў закона, выкарысталі матэрыял, якім, па сутнасці, кароўнікі накрываюць. Калі мы сустракаліся ў судзе, прадстаўнікі арганізацыі тлумачылі: «Якая гэта гісторыка-культурная каштоўнасць? Вы паглядзіце, як яна выглядае! Людзі нават не ўсведамляюць, што гэта — наша спадчына і мы павінны ёй ганарыцца.

Парушальнікаў аштрафавалі на тры мільёны рублёў. Але што значыць гэтая сума для буйнога прадпрыемства? Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і тым, што дзяржаўнай праграмы па падтрымцы сядзіб няма, таму іх лёс цалкам знаходзіцца ў руках уласнікаў.

ХТО Ў МАЁНТКУ ГАСПАДАР?

— У першую чаргу неабходна знайсці ўласніка для ўсіх аб'ектаў, — перакананы **дырэктар фонду «Краіна замкаў» Аляксандр ВАРЫКІШ.** — Прычым неабавязкова пад патрэбы аграэкатурызму — пад любыя патрэбы, абы толькі людзі забіралі і даглядалі іх. Таму што ёсць прыклады проста жудасныя. Напрыклад, у Жамыслаўлі Іўеўскага раёна калгас прадаў будынак уласніку, пасля дзяржкантроль выявіў парушэнні і набытак забралі. Так будынак стаяў, пакуль не здарыўся пажар, і цяпер ён без даху разбураецца.

Аляксандр Варыкіш адзначыў, што ў куплі-продажы сядзіб, нават не прызнаных гісторыка-культурнай спадчынай, ёсць складанасці. Калі ў 2007 годзе можна было купіць сядзібу на аўкцыёне на раённым узроўні, то цяпер гэтая працэдура адбываецца на ўзроўні вобласці. Дырэктар фонда таксама дадаў, што цэны на пакупку сядзіб праз аўкцыёны даходзяць і да 80—100 тысяч долараў. Сапраўды, можа атрымацца проста касмічная сума з улікам таго, што купленую сядзібу трэба яшчэ давесці да ладу.

Наталля Хвір не згодна з тым, што сядзібы можна прыстасоўваць пад любыя патрэбы.

Цэны на пакупку сядзіб праз аўкцыёны даходзяць і да 80—100 тысяч долараў. Можа атрымацца касмічная сума з улікам таго, што купленую сядзібу трэба яшчэ давесці да ладу.

— Уласнік падпісвае ахоўныя абавязацельствы, у адпаведнасці з якімі ён нясе адказнасць за атрыманы ім будынак. Да таго ж ён у абавязковым парадку павінен узгадніць з Міністэрствам культуры змену прызначэння аб'екта.

Таксама спецыяліст звярнула ўвагу на тое, што ўласнік абавязаны прадастаўляць турыстам доступ да набытага ім аб'екта, але ён можа вызначаць, калі прадастаўляць гэты доступ.

Валанцёр Зміцер Юркевіч, член арт-суполкі імя Тадэвуша Рэйтана, якая займаецца аднаўленнем яго сядзібы ў вёсцы Грушаўка, перакананы, што падобныя аб'екты павінны заставацца на папячэнні дзяржавы. На яго думку, аднаўленне сядзібы Рэйтана і стварэнне там музейных экспазіцый шырокага профілю «за вушы выцягне Ляхавіцкі раён».

— Мы не абмяжоўваліся толькі суботнікамі і латаннем дахаў, а пісалі артыкулы і ініцыявалі стварэнне каналам АНТ стужкі «Тадэвуш Рэйтан — беларускі Дон Кіхот» цыкла «Зваротны адлік». Фактычна цяпер ідзе вяртанне імені, і дзякуючы гэтаму з'явіцца цікаўнасць да роду і да сядзібы.

Аб тым, наколькі ахвотна беларусы бяруць на сябе цяжар гісторыка-культурнай спадчыны, сведчыць няўмольная статыстыка: у прыватнай уласнасці знаходзіцца каля 10% сядзіб. Па словах **начальніка ўпраўлення карпаратыўнага бізнесу Белагропрамбанк Святланы КОНЧЫЦ,** яшчэ не было ніводнага выпадку, каб людзі звярталіся ў банк па крэдыт на пакупку гістарычных сядзіб.

Не актыўна купляюць нашы сядзібы і замежнікі. І хоць на аўкцыёнах цэны могуць зніжацца, гэта ўсё адно не вырашае праблемы: на ўласніка кладуцца надта вялікія патрабаванні. Наталля Хвір падтрымлівае спрашчэнне сістэмы перадачы сядзіб уласнікам, але адзначае, што ў гэтай справе не ўсё залежыць ад Мінкульта — ёсць яшчэ іншыя ведамствы і мясцовыя органы ўлады. Падаецца, у паўнамоцтвах гэтых устаноў распрацоўваць канкрэтныя шляхі аховы нацыянальнай культурнай спадчыны, якую даверыў ім народ, бо гэта іх прамы абавязак. А яны не могуць прыйсці да згоды паміж сабой, тым часам як старадаўнія сядзібы не могуць чакаць вечна. Яны з усёй сілы стогнуць разбітымі сценамі, заклікаюць пустымі ваканцамі, лямантуюць дзіравымі дахамі і ў рэшце рэшт, выпусціўшы свой апошні працяглы ўздых, разбураюцца. Дык хто возьме на сябе адказнасць за перакананасць многіх беларусаў у тым, што ў нашай краіне няма на што паглядзець?..

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

■ Ведай нашых

БЕЛАРУСКА СТАЛА ВІЦЭ-КАРАЛЕВАЙ ПРЫГАЖОСЦІ СЯРОД СТУДЭНТАК ВНУ 8 КРАІН

У фінале міжнароднага конкурсу «Каралева Вясна-2014», які прайшоў у Чыце, 20-гадовая студэнтка Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта Ганна Мядзелец атрымала тытул першай віцэ-міс. А карона пераможцы дасталася ўдзельніцы з Расіі — студэнткі Саратаўскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя Ю. Гагарына Маргарыце Паркінай.

Фота brsm.by.

З узнагародамі вярнуліся з форуму прыгажосці і іншыя прадстаўніцы нашай краіны — пераможцы беларускага этапу конкурсу, арганізаванага пад эгідай Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Так, Марына Цундэр з Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С.Пушкіна перамагла ў намінацыі «Міс экстравагантнасць», а студэнтка БДУ Настасся Капцюг заваявала тытул «Міс творчасць». Дарэчы, ад тытула другой віцэ-міс беларускую прыгажуню аддзяліла ўсяго адна сотая бала!

Усяго ж у фінале міжнароднага міжвузаўскага конкурсу грацыі і артыстызму ўзялі ўдзел 12 дзяўчат з ВНУ 8 краін: Беларусі, Расіі, Казахстана, Таджыкістана, Узбекістана і Кыргызстана, а таксама Кітая і Індыі. Дарэчы, сёлета гэтае мерапрыемства праходзіла ў 23-і раз, але ўпершыню фінішавала ў Расіі, у межах міжнароднага фестывалю «Студэнцкая вясна краін Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва». Асноўнымі ж крытэрыямі адбору ўдзельніц конкурсу, як неаднаразова падкрэслівалі яго арганізатары, сталі далёка не адны толькі знешнія даныя, таксама камунікабельнасць, сцэнічная культура і веданне этыкету, пачуццё гумару, грацыя, інтэлектуальныя і творчыя здольнасці, артыстычнае майстэрства і актыўны ўдзел у маладзёжных праектах і праграмах у сваіх краінах.

Наступны конкурс, як плануецца, будзе праводзіцца ў Беларусі.

Вікторыя ЗАХАРАВА

■ Фінансавы выдатнік

КУПЛЯЦЬ ЗАМЕЖНУЮ ВАЛЮТУ РЫЗЫКОЎНА?

У абменніку вы маеце права праверыць купюру і патрабаваць яе абмену на іншую

Адна наша чытачка нядаўна сутыкнулася з праблемай пры абмене беларускіх рублёў на расійскія. Дзяўчыне трэба было купіць пэўную суму «драўляных» і адправіць пераводам у Расію. Спачатку яна набыла неабходную колькасць валюты ў абменніку, а потым панесла грошы ў іншы банк, каб зрабіць перавод. Але адну купюру ў дзяўчыны не ўзялі, спаслаўшыся на тое, што яна засвечваецца на ўльтрафіялеце. Іншымі словамі, банкнота, відаць, была некалі пад хімічным уздзеяннем. Што ж цяпер рабіць?

Калі б размова ішла аб пашкоджанні айчыннай купюры, то праблем ніякіх — у структурных падраздзяленнях Нацыянальнага банка і іншых банках краіны можна абмяняць старыя, пашкоджаныя альбо «засвечаныя» банкноты на новыя. Усю інфармацыю аб парадку такога абмену можна знайсці на сайце Нацыянальнага банка Беларусі nbrb.by ў раздзеле «Банкноты і манеты».

Але ж тут замежная валюта. Няхай нават і суседняй краіны. «Не трэба думаць, што Нацыянальны банк нясе адказнасць за ўсе валюты. Калі вы набываеце тую ці іншую замежную валюту, то згаджаецеся на пэўную рызыку», — гаворыць **Віктар САСНОЎСКІ, галоўны спецыяліст Галоўнага ўпраўлення наяўнага грашовага абарачэння Нацыянальнага банка.**

Аказваецца, што ў кожнага банка розныя прыкметы плацежнасці купюр. Нехта возьме пацёртую ці троху «засвечаную», а нехта — не. І гэта, паводле слоў спецыяліста, лічыцца нармальным, таму што ўся замежная валюта мае своеасаблівыя прыкметы. За іх нясе адказнасць Цэнтральны банк той краіны, дзе грошы былі выпушчаны ў абарачэнне.

Аднак дрэнную купюру ў дзяўчыны не ўзялі назад у абменніку. «А вось гэта ўжо самавольства, — тлумачыць Віктар Сасноўскі. — Але амаль немагчыма даказаць, што вы набылі менавіта гэтую купюру ў пэўным абменніку». А значыць, трэба заўсёды быць пільнымі. Спецыяліст раіць перапраўляць усё не адыходзячы ад касы. Касір не ў праве адмовіць прасвяціць па вашай просьбе ва ўльтрафіялеце банкноты і замяніць тыя, якія будуць дрэннымі.

«Калі ўжо вы набылі пашкоджаную купюру, то проста наведайце абменнікі розных банкаў. Ва ўсіх адрозніваюцца крытэрыі, а значыць, у нейкім могуць прыняць гэтыя грошы», — лічыць Віктар Сасноўскі.

❍ ❍ ❍

Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 8 017 292 38 02.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

ЧЫМ БОЛЬШЫЯ ЗНІЖКІ, ТЫМ ТАНЧЭЙШЫ КАШАЛЁК

Ад 15 і больш

Адны з самых папулярных зніжак у беларускіх харчовых крамах — зніжкі на тавары, тэрмін прыдатнасці якіх павінен выйсці на працягу бліжэйшага часу. Самая відавочная зніжка. Такім чынам крама адначасова пазбаўляецца ад заляжалага тавару і, разам з тым, зводзіць да мінімуму страты. Другі від зніжак — аптовыя. Калі крама купляе вялікую колькасць тавару ў вытворцы, то часта робіцца значная зніжка. Калі крама не зменіць нацэнку пры продажы, то дабаўленая вартасць тавару будзе меншай, таму як набыты ён па аптовай (больш нізкай у гэтым выпадку цане). Трэці від зніжак — калі гандлёвая сетка заключае спецыфічных кантракт з пастаўшчыком прадукцыі. Напрыклад, калі пастаўшчык толькі выходзіць на рынак продажаў, ён праводзіць рэкламную кампанію ў краме, дзе для прадукцыі пастаўшчыка адводзіцца спецыяльнае месца, што робіць тавар прыкметней. На пачатковым рэкламным этапе такі тавар можа быць значна таннейшым за свае аналагі, а значыць, больш прывабным для пакупніка.

У псіхалогіі пакупнікоў ёсць тэндэнцыя заўважаць першую значную для іх лічбу — 15%. Ці павысілі ім заробак, ці зрабілі зніжку, павысілі кошт на бензін — большасць людзей зверне на гэта ўвагу, толькі тады, калі памер змены перавысіць 15%. Таму зніжкі ў 5% і нават 10% не прыцягнуць увагу да тавару. У далейшым, калі тавар спадабаецца, пакупнік купіць яго і без зніжкі. Зніжкі робяцца таксама для таго, каб стварыць імідж крамы — прадаўцы спадзяюцца павысіць узровень продажаў. Пры досыць добрым імідж крама пераходзіць з разраду «крокавай даступнасці», гэта значыць, разлічанай на людзей, якія жывуць побач з ёй, у больш папулярны гандлёвы пункт, да якога могуць з'язджацца пакупнікі з розных раёнаў горада. Для гэтага ў гандлёвых сетках распрацоўваюцца праграмы лаяльнасці кліентаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Праграмы лаяльнасці

Больш інавацыйны сістэмны ўзровень стварэння зніжак. Пакупніка «прывязваюць» да кропкі продажаў праз дысконтныя карты (напрыклад, на чацвёртую куплю за тыдзень зніжка 15% пры наяўнасці дысконтнай карты). Таксама некаторыя крамы прадаюць некалькі тавараў з павышаным попытам без нацэнкі, робячы іх танней, чым ва ўсіх астатніх крамах у горадзе. Тады інфармацыя аб тым, што ў такой краме пэўныя прадукты каштуюць танней, чым у астатніх, разыдзецца па наваколлі. А павялічваць продаж гэтыя крамы будуць за кошт дадатковых пакупак, якія людзі так ці інакш зробяць.

Такім чынам, пры стварэнні падобнай сістэмы ў гандлёвай сетцы спадзяюцца ў першую чаргу на тое, што пакупнік купіць такі тавар са зніжкай у дадатак да ўсіх астатніх тавараў без яе. Гэта павышае ўзровень продажаў і стварае станоўчы імідж выгаднай куплі менавіта ў гэтай краме. Зніжкі дапамагаюць таксама гандлёвым пунктам пазбавіцца ад заляжалага тавару, што прыводзіць да павелічэння прыбытку.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

АЎТАМАБІЛЬНАЕ ПАЛІВА ПАДАРАЖЭЛА НА 5%

Сёлета ўпершыню ў нашай краіне з 8 ліпеня павялічыліся цэны на аўтамабільнае паліва. Аб гэтым паведамляецца на сайце канцэрна «Белнафтахім».

Такім чынам, бензін маркі AI-92 (К5) цяпер каштуе 9300 рублёў за літр (было 8800 рублёў), AI-95 (К5) — 10 000 рублёў за літр (9500 рублёў), дызельнае паліва (К3) падаражэла да 10 100 рублёў за літр (9600 рублёў), а дызель «Еўра 5» — 10 300 рублёў за літр (9800 рублёў).

Трэба нагадаць, што летась аўтамабільнае паліва даражэла 5 разоў, апошні ж раз аўтамабілістаў «узрадавалі» 28 снежня. Тады цэны былі перагледжаны «у мэтах частковай кампенсацыі павелічэння ставак акцызаў на падакцызныя нафтапрадукты з 1 студзеня 2014 года».

Цяпер падаражанне асобныя эксперты звязваюць не толькі з ростам курсу долара, але і з «традыцыйным» імкненнем улад уніфікаваць у Беларусі цэны на аўтамабільны бензін і дызпаліва з коштам іх у сумежных краінах, бо з-за падзення курсу рубля зноў з'явілася разбежка з расійскімі цэнамі. Да падаражання літр AI-92 у нашай краіне каштаваў 86 цэнтаў, у Смаленскай вобласці Расіі — 89, а ў Маскве і вобласці — 93 цэнты. Кошт за літр аўтапаліва ў краінах Балтыі — у паўтара раза вышэй. Лічыцца, што падобная ўніфікацыя такіх цэн выключыць развіццё ў нас паліўнага «турызму».

Сяргей КУРКАЧ.

■ Грошы ў крэдыт

У ПАРУЧЫЦЕЛЯХ — УСЯ СЯМ'Я

Жыллёвыя крэдыты абслугоўваюць ужо шэсць банкаў

Да пяці фінансавых устаноў, якія выдаюць фізічным асобам крэдыты на жыллё, з першых дзён ліпеня далучыўся банк БелВЭБ. Паводле банкаўскай праграмы крэдытавання, цяпер у насельніцтва існуе магчымасць узяць доўгатэрміновы крэдыт на куплю або будаўніцтва жылля, а таксама дач, садовых домікаў і нават гаражоў.

Трэба адзначыць, што гэта не нейкі новы фінансавы прадукт банка, а аднаўленне мінулых праграм, якія былі спынены некалькі гадоў таму. Сёння сітуацыя з наяўнасцю «доўгіх» грошай крыху палепшылася. Разам з тым, казаць пра нейкі «прарыў» у фінансаванні жыллёвай нерухомасці пакуль зарана, бо такія крэдыты і цяпер застаюцца даволі дарагімі.

Сёння банк БелВЭБ прапануе працэнтную стаўку па крэдытах у рамках праграм «Уласнае жыллё» і «Свая сядзіба» на ўзроўні 39% гадавых (СР + 17,5 п.п.). Але калі кліент купляе жыллё ў арганізацыі — партнёраў банка, то ён можа скарыстацца праграмай «Дружная будоўля» і атрымаць крэдыт па зніжанай працэнтнай стаўцы (мінус 1-2%). Разлік максімальнай сумы крэдыту прадугледжвае сукупны даход не толькі заяўніка і яго другой паловы (мужа, жонкі), але і іх блізкіх сваякоў (маці, бацькі, братоў, сясцёр), што дазваляе ўзяць вялікую суму крэдыту. Забеспячэннем крэдыту можа выступаць паручыцельства не менш чым дзвюх асоб, а таксама заклад самой нерухомасці. Максімальны тэрмін крэдыту складае ад 1 да 20 гадоў. Менавіта ад рэальнай плацежаздольнасці кліента залежыць узровень крэдытнага пакрыцця, які дасягае 80% кошту новага жылля.

У кол-цэнтры банка нам падлічылі максімальную суму, на якую можа прэтэндаваць сям'я з двух чалавек без дзяцей. Нас цікавіць сітуацыя, калі сукупны штомесячны чысты прыбытак мужа і жонкі складае 15 мільёнаў рублёў. У гэтым выпадку максімальная сума крэдыту складзе каля 276 млн рублёў. Пры такім даходзе кліентаў ім неабходна мець не менш чым дзвюх асоб у якасці паручыцеляў, даход якіх не ўлічваецца.

Банк можа падсумоўваць толькі даходы менавіта блізкіх сваякоў крэдытаатрымальнікаў: маці, бацькі, брата або сястры абаіх мужа і жонкі. Тут колькасць сваякоў не абмежавана. У гэтым выпадку сума крэдыту істотна павялічыцца. Напрыклад, пры сукупным даходзе крэдытаатрымальнікаў і іх сваякоў у 25 мільёнаў рублёў банк зможа даць крэдыт на суму больш за 610 млн рублёў. Атрымліваецца, што рэальна банк давярае фінансавую адказнасць па крэдытах толькі тым паручыцелям, якія адначасова з'яўляюцца блізкімі сваякамі кліентаў.

Нагадаю, што крэдыты на жыллё выдаюць таксама Беларусбанк, Белаграпрамбанк, БПС-Ашчадбанк, Прыорбанк і Белгазпрамбанк. Самыя танныя жыллёвыя крэдыты на агульных падставах прапануюцца Беларусбанкам для чаргавікоў — 37% гадавых. Праўда, і там хапае сваіх нюансаў па ўмовах атрымання.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Прамысловасць

Фота БЕЛТА.

КУДЫ ЗНІК БЕЛАРУСКІ ЛЁН?

Вытворчасць ільняных тканін з пачатку года скарацілася на 10,2% у параўнанні з аналагічным перыядам 2013-га

Нядаўна прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч раскрытыкаваў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў развіццё льняной галіны ў краіне. Вядома, што тэрміны мадэрнізацыі льнозаводаў не выконваюцца, галіна працуе стратна. З прыбыткам за студзень—красавік 2014 года — толькі льнозаводы Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. З боку Мінсельгасхарча ўсё яшчэ не было прынята ніякіх жорсткіх захадаў, каб выправіць становішча.

Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, вытворчасць ільняных тканін у студзені-маі 2014 года ў адносінах да аналагічнага перыяду 2013 года складае 89,8%. Усяго ж у натуральным выражэнні з пачатку года выраблена 10287 тыс. кв. м ільняной тканіны. Што датычыцца яе запасаў, то, па звестках Белстата, на 1 чэрвеня на складах знаходзіцца 6761 тыс. кв м. Гэта ў 3,3 раза больш за сярэднямесячны аб'ём вытворчасці прадукцыі.

Міхаіл Мясніковіч таксама адзначыў, што ўсе рэшткі мінулых гадоў павінны быць перапрацаваны да сёлетняга ўраджаю. Прэм'ер-міністр распарадзіўся забяспечыць устаноўку тэхналагічных ліній на ўсіх шасці льнозаводах і правесці пусканаладачныя работы. А менавіта на Карэліцкім, Ляхавіцкім, Пастаўскім, Арэхаўскім, Кармянскім і Слуцкім ільнозаводах.

Між іншым, па аб'ёмах вытворчасці льновалакна Беларусь займае чацвёртае месца ў свеце пасля Кітая, Францыі і Расіі. Наш лён добра вядомы ў суседзяў (Расія, Украіна, Літва) і некаторых краінах далёкага замежжа. Большая частка беларускай тканіны экспартуецца ў выглядзе сыравіны і паўфабрыкатаў у краіны, якія дапрацоўваюць нашу прадукцыю і забяспечваюць канкурэнтаздольнасць сваіх гатовых вырабаў за кошт нізкіх цэн закупкі ў Беларусі.

Згодна з пастановай Савета Міністраў ад 20 сакавіка 2013 года № 201 «Аб комплексным бізнес-плане развіцця льняной галіны Рэспублікі Беларусь у 2013-2015 гадах», стратэгічная мэта развіцця галіны — дасягненне высокай якасці льнопрадукцыі і яе рэнтабельная рэалізацыя ў рынкавых умовах на ўнутраным і знешнім рынках. Дамагчыся гэтага можна толькі шляхам вываду галіны на сучасны тэхналагічны ўзровень, у сувязі з чым у комплексным бізнес-плане прадугледжваюцца меры па двух кірунках: тэхнічным пераснашчэнні і ўдасканаленні арганізацыі вытворчасці. У поўным аб'ёме мадэрнізацыя льнозаводаў павінна быць завершана не пазней за 1 студзеня 2015 года.

Нягледзячы на высокую пазіцыю Беларусі ў сусветнай вытворчасці льновалакна, краіна мае нязначную долю ў экспарце лёну, у першую чаргу з-за нізкай якасці прадукцыі.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■

С «Растишка» в Диснейленд!

С 10 июля по 17 ноября проводится новая рекламная игра «С «Растишка» в Диснейленд». Чтобы принять в ней участие, купите 5 любых продуктов «Растишка» в одном чеке в магазинах сети «Гиппо», зарегистрируйте чек о покупке на сайте Gippo.by с 10 июля по 4 сентября. Станьте участником розыгрыша призов, который состоится 14 сентября: 2 ноутбука, 1 планшет, 5 велосипедов и главного приза – поездки в Диснейленд на двоих. Читайте подробные правила рекламной игры и присоединяйтесь!

ОФИЦИАЛЬНЫЕ ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «С Растишка в Диснейленд!»

Настоящие правила проведения рекламной игры «С Растишка в Диснейленд!» (далее – Правила), направленной на продвижение продукции, производимой под товарным знаком «Растишка», разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 №51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «С Растишка в Диснейленд!» (далее – Рекламная игра).

1. Организатор

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Пиар квадрат», УНП 191682518, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 7 июля 2011 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №191682518 (далее – Организатор). Местонахождение Организатора: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Амураторская, д. 4Б, пом. 20.

Заинтересованным лицом является Иностранное общество с ограниченной ответственностью «ДанонБел», зарегистрированное 25 июля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №191047642; местонахождение: 220035, г. Минск, пр-т Машерова, 76А, пом. 4, УНП 191047642 (далее – Заинтересованное лицо).

2. Участники Рекламной игры

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь.

Участником Рекламной игры (далее – Участник) не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

3. Название Рекламной игры: «С Растишка в Диснейленд!»

Территория и место проведения Рекламной игры: Рекламная игра проводится в объектах розничной торговли «ГИППО» на территории Республики Беларусь, а именно в объектах розничной торговли, расположенных по адресам, указанным

Таблица 1:

г. Минск	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, пр-т Рокоссовского, 2
	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, ул. Горецкого, 2
	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, ул. Городецкая, 30
	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, ул. Сухаревская, 31
	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, Игуменский тракт, 30
	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 3
	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, ул. Червякова, 57
Минский район	Магазин «ГИППО» по адресу Минский район, д. Боровая
г. Гомель	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Гомель, ул. Косарева, 18
г. Могилев	Магазин «ГИППО» по адресу: г. Могилев, ул. Мовчанского, 6

4. Срок начала Рекламной игры: 10 июля 2014 г.

5. Срок окончания Рекламной игры: 17 октября 2014 г.

6. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:

все товары, выпускаемые под товарным знаком «Растишка».

8. Призовой фонд Рекламной игры

Призовой фонд Рекламной игры формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица в размере **60 648 408** (Шестьдесят миллионов шестьсот сорок восемь тысяч четыреста восемь) белорусских рублей. Призовой фонд рекламной игры включает следующие призы:

№ п./п.		Наименование приза	Кол-во, шт.	Стоимость, бел. руб.	Общая стоимость с НДС, бел. руб.
Главный приз		Туристическая поездка в Диснейленд в г. Париж на 2-х человек (авиаперелет, пакет услуг по оформлению виз, туристический пакет «проживание и посещение Диснейленда»)*	1	24 710 000	24 710 000
		денежное вознаграждение в размере	1	3 266 591	3 266 591
Промежуточные призы	1.	Велосипед GT Aggressor 20 RD"14	5	2 890 000	14 450 000
		денежное вознаграждение в размере	5	291 136	1 455 680
	2.	Ноутбук HP 15-g025er 15,6"дисплей	2	4 018 000	8 036 000
		денежное вознаграждение в размере	2	444 955	889 910
	3.	Интернет-планшет i-Pad Apple MD788TU/A	1	6 990 000	6 990 000
		денежное вознаграждение в размере	1	850 227	850 227
		ИТОГО			**60 648 408**

* Туристическая поездка включает в себя:

• Авиаперелет Минск – Париж – Минск, 2 билета эконом-класса, а/к Белавиа (авиаперевозчик может быть заменен в случае изменения расписания по предварительному согласованию сторон с сохранением общей стоимости, начального и конечно пунктов следования).

• Пакет «проживание + посещение Диснейленда», включая: проживание в Париже в отеле категории 3* 3 ночи, питание – завтраки, входные билеты в Диснейленд на 1 день, билеты на поезд RER до Диснейленда.

• Визовый сбор посольства Франции, 2 человека.

• Услуги по оформлению въездной визы во Францию, 2 человека.

**Туристической поездкой можно воспользоваться в период с 29 октября 2014 г. по 16 ноября 2014 г.

9. Порядок участия в Рекламной игре, определения Победителей и получения призов:

9.1. Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 10 июля 2014 г. до 3 сентября 2014 г. (включительно) совершить совокупность следующих действий:

9.1.1. Единовременно (удостоверяется одним кассовым чеком) приобрести в объектах розничной торговли «ГИППО» (Таблица 1) не менее пяти единиц товара (в любом сочетании) под товарным знаком «Растишка».

9.1.2. Зарегистрироваться на Интернет-сайте www.gippo.by, заполнив регистрационную форму, содержащую для заполнения обязательные поля: фамилия, имя (полностью), отчество (полностью); адрес места жительства: почтовый индекс, область, район, населенный пункт, улицу, дом, номер квартиры; контактный номер телефона; номер кассового чека, который находится в верхней части кассового чека под наименованием «Док No»; дата кассового чека; адрес магазина «ГИППО», e-mail.

Доступ к Интернет-сайту www.gippo.by предоставляется без взимания платы и заключения договора лицом, являющимся владельцем этого сайта.

После регистрации Участник получает уведомление об успешной регистрации либо об ее отклонении в случае повторно введенного номера кассового чека или нарушения порядка и условий регистрации, установленных настоящими Правилами.

9.1.3. Один кассовый чек может принимать участие в Рекламной Игре только один раз. В том случае, если номер кассового чека будет введен более одного раза, он будет приниматься только один раз по факту первого ввода номера кассового чека.

9.2. Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии покупки товаров, выпускаемых под товарным знаком «Растишка», в необходимом количестве и выполнения требований, необходимых для участия в Рекламной игре.

9.3. Каждый Участник может выиграть не более 1 (одного) Промежуточного приза и не более 1 (одного) Главного приза.

9.4. Организатор не несет ответственности за ошибки, допущенные Участниками Рекламной игры при вводе регистрационных данных, и за достоверность сведений, указанных при регистрации на Интернет-сайте.

9.5. Организатор не вступает в спор в случае возникновения вопросов об определении достоверности регистрационных данных того или иного лица. Все Участники должны сохранить чек, подтверждающий покупку товаров под товарным знаком «Растишка» до окончания Рекламной игры.

9.6. Розыгрыш Промежуточных призов и Главного приза проводится Организатором Игры **4 сентября 2014 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Амураторская, 4Б, офис 20.

9.7. На каждый зарегистрированный чек на Интернет-сайте www.gippo.by, оформляется одна карточка, которая содержит порядковый номер и ФИО Участника. Порядковый номер Участника присваивается по дате и времени регистрации в порядке очередности.

9.8. Механика проведения розыгрыша Промежуточных призов: все карточки засыпаются во вращающийся барабан и перемешиваются, затем из вращающего барабана достаются карточки в количестве, соответствующем количеству Промежуточных призов – так определяются Победители. Призы распределяются в порядке, указанном в п. 8.

Таким же образом определяется получатель Главного приза.

После того, как определены Победители Промежуточных розыгрышей и розыгрыша Главного приза, формируется резервный список Победителей розыгрыша Промежуточных призов, порядок использования которого указан в п. 9.12. Резервный список формируется следующим образом: все карточки, оставшиеся после розыгрыша Промежуточных призов и розыгрыша Главного приза, засыпаются во вращающийся барабан и перемешиваются, затем из вращающего барабана достаются карточки в количестве:

- 1 карточка для приза «Велосипед GT Aggressor 20 RD"14»
- 1 карточка для приза «Ноутбук HP 15-g025er 15,6"дисплей»
- 1 карточка для приза «Интернет-планшет i-Pad Apple MD788TU/A».

Таким образом, формируется резервный список Победителей розыгрыша Промежуточных призов из 3 (трех) человек.

9.9. Организатор связывается с Победителем по указанному в регистрационной форме номеру телефона и отправляет по указанному в регистрационной форме адресу заказное письмо с уведомлением не позднее **9 сентября 2014 года**.

9.10. Победители могут явиться **14 сентября 2014 года** к 14.00 в магазин «ГИППО» по адресу: г. Минск, ул. Горецкого, 2 на торжественную церемонию, посвященную вручению сертификатов на получение Призов.

9.11. В случае если Победитель не явился 14 сентября к 14.00 в магазин «ГИППО» на торжественную церемонию, то для получения Приза или для написания заявления о передаче права на Главный приз любому лицу, Победитель должен явиться по адресу: г. Минск, ул. Амураторская, 4Б, офис 20 с паспортом и кассовым чеком (оригинал), подтверждающим покупку, предварительно связавшись с представителем Организатора по телефону (017) 306 25 71 не позднее 17.00 часов **18 сентября 2014 г.**

Для оформления туристических услуг Победитель должен обратиться в туристическое агентство ЧУП «Дискавери бизнес групп», находящееся по адресу: г. Минск, пер. Тучинский, 2-12 не позднее 17.00 часов **29 сентября** 2014 года, предоставив врученный ему Организатором Сертификат.

9.12. В случае если получатели Промежуточных призов не являются в указанный срок за Призом, либо с Победителями не удается связаться и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, указанных при регистрации, право на Приз переходит к Участнику Рекламной игры из резервного списка.

9.13. Организатор связывается с Победителем из резервного списка по указанному в регистрационной форме номеру телефона и отправляет по указанному в регистрационной форме адресу заказное письмо с уведомлением не позднее **24 сентября 2014 года.** Для получения Приза, Победитель из резервного списка должен явиться по адресу: г. Минск, ул. Амураторская, 4Б, офис 20 с паспортом и кассовым чеком (оригинал), подтверждающим покупку, предварительно связавшись с представителем Организатора по телефону (017) 306 25 71 не позднее 16.00 часов **29 сентября 2014 г.**

9.15. В случае если Призы не получены в установленные Правилами Рекламной игры сроки, либо с Победителями (в том числе из резервного списка) не удается связаться и уведомить о выигрыше из-за некорректных данных, указанных при регистрации, Промежуточные призы и Главный приз передаются Организатором Заинтересованному лицу.

9.16. В случае, если победитель розыгрыша Главного приза получает отказ в выдаче визы для осуществления туристической поездки или отказ/неполучение иных разрешений, необходимых для выезда за пределы Республики Беларусь, победитель имеет право передать право на Главный приз любому лицу до 17.00 часов 18 сентября. Для этого, Победителю необходимо написать заявление о передаче Главного приза.

10. Информация о Рекламной Игре, публикация Правил Рекламной Игры

10.1. Правила Игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Игры.

10.2. Результаты Игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок по 17 октября 2014 г.

10.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной Игре можно получить на сайте www.gippo.by, а также по телефону (375 44) 7-222-000, круглосуточно и без выходных. Звонок платный, в соответствии с тарифами оператора, которым пользуется Участник.

11. Комиссия по проведению Игры, регламент деятельности

11.1. Для контроля над соблюдением официальных Правил Рекламной Игры, утверждения результатов, подведения итогов по результатам проведения Рекламной Игры, рассмотрения спорных случаев, принятия решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникших при проведении Рекламной Игры, Организатор создает комиссию в составе 5-ти человек:

1. Живоглод Елена Николаевна, маркетолог ООО «Пиар квадрат»;
2. Малышко Галина Геннадьевна, маркетолог ООО «Пиар квадрат»;
3. Волощук Ирина Евгеньевна, главный бухгалтер ООО «Пиар квадрат»;
4. Алексеенко Татьяна Владимировна, индивидуальный предприниматель;
5. Сорокина Зарина Николаевна, индивидуальный предприниматель.

12. Прочие условия

12.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

12.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Рекламной игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

12.3. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет (например, плохое соединение с провайдером, поломки в сети и т.д.).

12.4. Организатор оставляет за собой право произвести экспертизу чеков, предъявленных Победителями Рекламной игры, для определения их подлинности.

Все чеки, по которым получены Призы, передаются Организатору и возврату Участникам не подлежат.

12.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

12.6. Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Амураторская, д. 4Б, пом. 20.

Свидетельство № 2401 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 25 июня 2014, зарегистрировано Министерством торговли Республики Беларусь.

ДЫПЛАМАТЫЯ СТАРЫХ ПАШТОВАК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усе жыва цікавіліся гісторыяй Беларусі і задавалі шмат пытанняў. Удзельнікі сустрэчы па-добраму здзіўляліся, што ў газетнага праекта, звязанага з публікацыяй рэпрадукцый старых паштовак, такое доўгае жыццё. Старшыні беларускага земляцтва ў Нью-Ёрку Савелію Капланскаму я падарыў кнігу «Сінагогі» — першы альбом з серыі «У пошуках страчанага».

Але, напэўна, цэнтральнай падзеяй стала прэзентацыя аўтарскага праекта Уладзіміра Ліхадзедава «У пошуках страчанага» ў Бібліятэцы Кангрэса ЗША, арганізаваная па ініцыятыве амерыканскага боку. У мерапрыемствах прымалі ўдзел прадстаўнікі Дзярждэпартамента ЗША, аналітычных і навуковых цэнтраў, гісторыкі, выкладчыкі ўніверсітэтаў. У бібліятэцы ёсць амаль усе філакартычныя альбомы У. Ліхадзедава, якія выдадзены ў свет рознымі выдавецтвамі Беларусі. Сярод іх — «У пошуках страчанага», «Знічкі Айчыны», «Сінагогі», «Мінск: падарожжа ў часе», «Беларусь вачыма нямецкага салдата»... У гэтай вядомай усяму свету кніжнай скарбніцы беларускага гісторыка прымаюць ужо другі раз. У 2011 годзе ў Вашынгтоне адбылася з удзелам аўтара праекта прэзентацыя альбома «Тадэвуш Касцюшка на старых паштоўках».

— Прадстаўляючы ў Бібліятэцы Кангрэса ЗША і праект «У пошуках страчанага» ў цэлым, і адну са сваіх навінак — кнігу «Падарожжа ў часе», — расказвае Часовы Павераны Рэспублікі Беларусь у ЗША Павел Шыдлоўскі, — беларускі калекцыянер здзейсніў сапраўдны фурор. Амерыканцам цікава было даведацца, што праект, распачаты на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня» роўна дзесяць гадоў таму, атрымаў шырокае прызнанне і сусветную вядомасць. У рамках праекта аўтарам было выдадзена 14 кніг, праведзена больш за 50 выставак у розных краінах свету, адноўлены два раней страчаныя помнікі. Прысутныя з непадробнай цікавасцю ўступалі ў дыялог з У. Ліхадзедавым, які расказаў ім пра беларускую гісторыю, нашых знакамітых землякоў. Кожны мог пагартаць кнігі, пабачыць, як выглядалі сто гадоў таму беларускія мястэчкі і гарады, уважліва разглядалі хрысціянскія храмы, сінагогі, мячэці, многія з якіх не захаваліся. Амерыканскія госці былі ўражаны аб'ёмам выкананай работы, адлюстраваннем многіх раней не вядомых гістарычных фактаў. Удзельнікі мерапрыемства адзначылі, што па выніках прэзентацыі яны з захапленнем і здзіўленнем адкрылі для сябе новую, раней не вядомую ім Беларусь.

У падарунак Бібліятэцы Кангрэса ЗША Уладзімір Ліхадзедаў перадаў кнігу «Падарожжа ў часе», якая была ўручана кіраўніку Еўрапейскага аддзела Бібліятэкі Гранту Харысу.

Творчасць Уладзіміра Ліхадзедава адкрывае перад чытачамі факты гісторыі, якія аб'ядноўваюць Беларусь і ЗША. Кніга «Тадэвуш Касцюшка» — дакладны прыклад гэтаму: большасць амерыканцаў і не здагадваецца, што герой Амерыкі, барацьбіт за незалежнасць Злучаных Штатаў нарадзіўся на беларускай зямлі. Сімвалічна, што мерапрыемства праводзілася ў пярэдадзень галоўных нацыянальных свят Беларусі і ЗША.

Прыкметнай падзеяй стала і знаёмства з кнігай «Беларусь і мусульманскі свет». Сустрэчу арганізавала Асацыяцыя крымскіх татар Нью-Ёрка на чале з яе кіраўніком Улькерам Асманавым. Былі на прэзентацыі і нашчадкі татар, якія раней пражывалі ў Беларусі.

Прыезд беларускага гісторыка і калекцыянера ў ЗША заўважылі і ацанілі і амерыканскія мас-медыя. Будзем лічыць, што старая паштоўка — добры аргумент у развіцці добрых сяброўскіх адносін паміж краінамі і народамі.

Кірыл ЛАДУЦЬКА.

■ На хвалі сяброўства

«Я, СЕРБ, ЗНАХОДЖУСЯ ТУТ МІЖ СВАЯКОЎ»

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь Велька Кавачавіч — аб агульных каранях, эканамічных стасунках і нацыянальных асаблівасцях.

Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

— Паважаны спадар пасол, як Вас лепш за ўсё прадставіць беларускай грамадскасці? Што варта было б адзначыць і падкрэсліць асобна?

— Я прафесійны дыпламат, працаваў у Пакістане, Румыніі, Расіі... І вось, маю гонар быць Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь. Займаўся я пытаннямі краін былога Савецкага Саюза шмат гадоў, таму, адпаведна, знаёмы і з абставінамі на постсавецкай прасторы ўвогуле.

— Раней вы бывалі ў Беларусі?

— Неаднойчы бываў, і затрымліваўся, у шэрагу рэспублік былога СССР... А вось у Беларусі, на жаль, я апынуўся ўпершыню.

— І як вы нашу Беларусь уяўлялі сабе на падставе звестак СМІ, літаратуры?..

— Павінен сказаць, што мае веды і ўяўленні пра Беларусь засноўваліся не на СМІ... Я падкрэсліваю гэта, маючы на ўвазе тое, што вялікія, сусветныя СМІ не праяўляюць асаблівай цікавасці да меншых народаў — такіх, як сербы і беларусы, — акрамя выпадкаў, калі ў іх, барані Божа, здараецца нешта страшнае. Я меў дастаткова поўную і адэкватную інфармацыю пра рэальнасць жыцця і развіцця сяброўскай, братэрскай Беларусі.

— Гэтыя ўяўленні змяніліся пасля новага прызначэння і непасрэднага знаёмства з нашай краінай?

— Так, яны пэўным чынам змяніліся. Але выключна ў пазітыўным плане. Прычым ужо з таго моманту, калі я ступіў на брацкую беларускую зямлю і сваімі вачыма на яе паглядзеў. Перш за ўсё, мяне парадавала тое, што наваколле тут — неверагодна багатае на зялёныя колеры, якіх я не заўважаў у Сербіі. Ды і ўсё, што давялося ўбачыць за гэты час у сталіцы вашай дзяржавы, у Мінску (уладкаванне і функцыянаванне горада, яго архітэктура, а таксама людзі), мяне станоўча ўразіла. Калі азначаць маё асабістае адчуванне, то яно вось якое: я, серб, знаходжуся тут між сваякоў, родзічаў... Гэта дадаткова ўзмацняе ўражанні. Часам нават забываюся, што я тут — пасол замежнай краіны, а не адзін з вас, беларусаў.

— Прыемна чуць, што вы так хутка і моцна «прыкіпелі душою» да Беларусі. Дык, можа, тут ёсць дадатковыя прычыны — якія-небудзь глыбінныя повязі? Напрыклад, тое, што вашы далёкія продкі паходзілі з нашых краёў?

— Гістарычныя сувязі паміж Сербіяй і Беларуссю яшчэ не вывучаны ў дастатковай ступені. Але бясспрэчным з'яўляецца наша агульнае паходжанне. Я вось здаўна памятаю меркаванні некаторых сербскіх гісторыкаў пра тое, што частка славянскіх плямён дрыгавічоў, крывічоў і радзімічаў дайшла да Балканскага паўвострава. Адпаведна, магчыма, што продкі ў нас агульныя. І па цяперашні час на нашых землях — у Герцагавіне і Чарнагорыі — засталіся паданні пра гэтыя плямёны, асабліва пра дрыгавічоў. Так што мае продкі вельмі добра ўсведамлялі сваё адзінства з рускімі і беларусамі, і такое ўсведамленне захоўваецца. Гэта, можна сказаць, наша сямейная традыцыя. І мой абавязак — перадаць яе дзецям, наступным пакаленням.

Хачу яшчэ звярнуць увагу вось на які эпізод з сямейнай гісторыі: маіх бацьку і маці ў Ліцы (сучасная Харватыя) хрысціў рускі свяшчэннік айцец Мікалай... (вядома, што ён пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пакінуў Расію, апынуўся ў Каралеўстве сербаў, харватаў і славенцаў (Югаславіі) як бежанец, а потым стаў свяшчэннаслужыцелем Сербскай Праваслаўнай Царквы).

— На што вы перш за ўсё звернеце ўвагу сваіх суайчыннікаў і замежных грамадзян увогуле, калі спатрэбіцца даць кароткую характарыстыку стану цяперашняй Беларусі?

— Перш за ўсё я параіў бы кожнаму, хто мае магчымасць, прыехаць у Беларусь. Каб самому, на свае вочы пабачыць яе прыгажосць, а таксама адчуць высакароднасць, гасціннасць і дабрыню беларускага народа. Каб асабіста пераканацца ў тым, што ваша краіна пастаянна развіваецца, жадае дасягнуць прагрэсу.

— А што з беларускага вопыту, на ваш погляд, можа быць карысным для цяперашняй Сербіі?

— Для Сербіі было б карысна запазычыць ваш вопыт у галіне эканомікі, пачынаючы ад фарміравання вытворчых магутнасцяў на прадпрыемствах, развіцця іх канкурэнтаздольнасці і да ролі дзяржавы ў эканоміцы.

— З другога боку, які пазітыўны вопыт Сербіі магла б скарыстаць Беларусь?

— Сербы на працягу стагоддзяў праяўлялі выключную ўпартасць і трывалась у абароне сваіх нацыянальных інтарэсаў, нават нягледзячы на тое, што страчвалі дзяржаўнасць, вымушаны былі масава перасяляцца на іншыя тэрыторыі і г.д. Аднак такое нешта я заўважыў і ў беларусаў. Таму, напэўна, гэта, хутчэй, поле ўзаемадзеяння нашых народаў, а не пазітыўны вопыт уласна сербскага народа.

«Калі сербы аказваліся ў бядзе, беларусы заўсёды праяўлялі брацкую салідарнасць і выключную чалавечнасць».

— Больш за чатыры дзесяцігоддзі, займаючыся культурай Сербіі, я часта разважаю пра падабенства лёсаў і характараў нашых народаў. А як вы глядзіце на гэта?

— Што датычыцца характэрных рыс нашых народаў, у аснове іх ляжыць адзін славянскі тып. Асаблівасці абодвух народаў, па сутнасці, вельмі станоўчыя. Аднак думаю, што наша любоў да праўды і наіўнасць набываюць, што называецца, «сваю цану» ў адносінах з іншымі народамі. Ведаючы, што за намі праўда, мы недастаткова рупімся, каб даказаць гэта іншым, бо апрыёры верым у добразычлівасць усіх людзей.

Праўда сербы, як правіла, больш тэмпераментныя, схільныя хутка прымаць рашэнні і залішне лічаць сябе важнымі. Беларусы ж, на мой погляд, больш сціплыя, настойлівыя і арганізаваныя.

— Мне часта даводзілася чуць самыя цёплыя словы пра сербаў ад беларусаў; і пра беларусаў ад сербаў таксама. Прычым, на маё ўспрыманне, гэта не дзяжурная ласкавасць. А на ўспрыманне ваша?

— Гэта не абмен «любезнасцямі». Тут справа ў калектыўным свядомым і неўсвядомленым разуменні, а таксама адчуванні сяброўства і братэрства паміж нашымі народамі.

— Згодны. І выяўляецца гэта больш за ўсё ў крытычных сітуацыях. У мудрай беларускай народнай прыказцы гаворыцца: «Абліжы мяне, калі горка. А калі соладка, я і сам абліжуся». Беларусы, калі сербам было горка, не адварочваліся...

— Калі сербы аказваліся ў бядзе, беларусы заўсёды праяўлялі брацкую салідарнасць і выключную чалавечнасць. Дастаткова згадаць толькі тое, што падчас агрэсіі НАТА і несупынных бамбардзіровак Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка быў адзіным кіраўніком замежнай дзяржавы, які тады наведаў Сербію. Ды і нядаўнія праявы салідарнасці, звязаныя з катастрафічнай паводкаю ў Сербіі, вельмі кранальныя: акрамя велізарнай падтрымкі Беларусі як дзяржавы, яе грамадзяне тут, у пасольства звяртаючыся, выказвалі такую салідарнасць, якую цяжка апісаць.

— Вы, прыняўшы на сябе абавязкі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла ў нашай краіне, зразумела, галоўным лічыце ўсталяванне ўсё мага лепшых палітычных і эканамічных узаемасувязяў. Што б вы асабіста сказалі пра вынікі нядаўняга афіцыйнага візіту нашага Прэзідэнта ў вашу краіну?

— Візіт Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў Сербію не толькі пацвярджае традыцыйна добры і сяброўскі характар адносін паміж нашымі краінамі, але і адкрывае зусім новыя магчымасці для супрацоўніцтва ва ўсіх сферах. Падчас візіту Прэзідэнта Беларусі былі падпісаны восем двухбаковых пагадненняў. У гэты ж час у Сербіі адбыўся бізнес-форум, у якім з сербскага боку ўдзельнічалі больш за 120 бізнесменаў і прадпрымальнікаў, а з беларускага — больш за 50. Зусім рэальным цяпер бачыцца чаканы ў бліжэйшым часе рост аб'ёму таварааабароту да 500 мільёнаў долараў, з цяперашніх 200.

Прэзідэнт Сербіі Томіслаў Нікаліч падчас гэтага візіту засяродзіў сваю ўвагу на вялікім значэнні ўсяго таго, што Прэзідэнт Лукашэнка зрабіў для Беларусі, для захавання міру, стабільнасці, пастаяннага прагрэсу ва ўсіх сферах, а таксама яго вялікага ўкладу ў развіццё сербска-беларускага супрацоўніцтва. Прэзідэнт Лукашэнка, у сваю чаргу, падкрэсліў, што Сербія — самы значны і лепшы сябра Беларусі не толькі на Балканах, але ва ўсёй Еўропе.

Акрамя ўсяго згаданага, сёлета ў Бялградзе адбудзецца пасяджэнне Міжурадавай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве. А ўвосень трэба чакаць і адпаведнага візіту з Сербіі ў Беларусь.

Такім чынам, падагульняючы сказанае, можна зрабіць толькі адну выснову: узаемаадносіны паміж нашымі дзяржавамі і народамі з цягам часу павінны станавіцца ўсё больш разнастайнымі і ўсё лепшымі.

— Усё-такі мы вядзём гаворку пераважна пра эканоміку. Аднак жа неацэннае значэнне маюць сувязі духоўныя, культурныя... У якой ступені вы гатовы ўмацоўваць і развіваць іх?

— Нашы культурныя і духоўныя сувязі маюць выключна багатую гісторыю, але сёння яны развіваюцца не зусім адпаведна запатрабаванням і магчымасцям нашых краін. Патрэбна як мага бліжэй звязваць культурныя інстытуцыі нашых краін. У гэтым працэсе дзяржаўныя структуры Сербіі будуць аказваць усялякую падтрымку. Думаю, што двухбаковыя творчыя выезды як слынных, так і маладых, яшчэ недастаткова актывізаваных, дзеячаў мастацтва маюць прыярытэтнае значэнне ва ўсіх сферах нашага культурнага супрацоўніцтва. Адпаведна, я таксама хачу падкрэсліць важнасць культурных і духоўных сувязяў, якія ўяўляюць сабою аснову блізкасці нашых народаў. У палітыцы і эканоміцы могуць быць ваганні, але культурныя сувязі не павінны залежаць ад гэтага.

— Мы з вамі добра ведаем фразу, якую некалі з гонарам прамаўлялі чарнагорцы: «Нас і рускіх дзвесце мільёнаў». Цяперашнія чарнагорцы-монтэнегрысты гэтага ўжо не згадваюць. А мы можам — не без гонару— заяўляць: «Нас і сербаў (Нас і беларусаў) дваццаць мільёнаў»?

— Цалкам згаджаюся з гэтым. Са свайго боку, хацеў бы і сам сказаць: «Нас і беларусаў дваццаць мільёнаў». Акрамя паходжання і глыбокіх гістарычных повязяў, нашы народы звязваюць таксама падобныя мовы, веравызнанне, культурныя традыцыі і шмат іншага.

— Я, сардэчна дзякуючы за цікавую і змястоўную размову, хацеў бы, з вашага дазволу, падвесці вынікі размовы пажаданнем: «Живела Србија! Заједно са Белорусијом»

Іван ЧАРОТА

■

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 12 августа 2014 г. торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

Предмет торгов (наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества)	Изолированное помещение общей площадью 218,8 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 117А-10Т (инвентарный номер 500/D-70784766, назначение – торговое помещение)
Начальная цена	5 331 677 000 белорусских рублей
Сумма задатка	533 000 000 белорусских рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22
Балансодержатель	СООО «Инвестиционно-строительная компания «Александров-Групп»

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится 12 августа 2014 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 14.07.2014 по 06.08.2014 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

Технический администратор доменной зоны BY УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ» сообщает о проведении благотворительного аукциона на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра.

Средства от аукциона, кроме стандартной стоимости услуг по регистрации доменного имени и налогов, будут перечислены на нужды детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей.

Предметом аукциона являются доменные имена в доменной зоне BY, исключенные из реестра национальной доменной зоны. Перечень доменных имен, предлагаемых к регистрации по результатам аукциона, размещен на сайте https://auction.cctld.by

Дата начала аукциона – 11 августа 2014 г., дата окончания аукциона – 21 августа 2014 г.

Время начала аукциона – 12.00 даты начала аукциона, время окончания аукциона – 12.00 часов даты окончания аукциона. В случае, если в течение последних 2 минут до окончания аукциона была сделана ставка, срок проведения аукциона автоматически продлевается еще на 5 минут.

Аукцион проводится на интернет-ресурсе http://auction.cctld.by

В отношении каждого доменного имени, являющегося предметом аукциона, размещается программная форма, позволяющая участникам аукциона делать ставки.

Участниками аукциона могут быть юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, являющиеся резидентами или нерезидентами Республики Беларусь. Для участия в аукционе участник должен пройти регистрацию на сайте http://auction.cctld.by

Начальная цена предмета аукциона составляет 300 000 белорусских рублей. Шаг аукциона – 50 000 белорусских рублей.

Прием ставок прекращается по истечении 10 календарных дней после начала аукциона по каждому доменному имени.

Аукцион считается состоявшимся при наличии хотя бы одной ставки.

Победившим в аукционе считается тот участник, который сделал максимальную ставку к моменту окончания аукциона.

Текст Положения о порядке проведения аукциона на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра, находится на сайте http://auction.cctld.by в разделе «Правила проведения аукционов»

Организатор аукциона: УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ», УНП 100160363, e-mail: au@hoster.by

Тел. организатора +375 17 239 57 02.

Тел. комиссии по организации и проведению аукциона +375 17 239 57 77.

■ Знешні вектар

У ПОШУКАХ НОВЫХ РЫНКАЎ, або Як мы «асвойваем» Афрыку

У апошнія гады ў Беларусі надаецца асаблівая ўвага супрацоўніцтву з дзяржавамі Афрыкі. Там адкрываюцца новыя пасольствы, прадстаўніцтвы нашых прамысловых прадпрыемстваў. Чым жа цікавы гэты рынак для нас? Якія перспектывы ён абяцае? Пра гэта, а таксама пра дасягнутае ў «асваенні» Афрыкі «Звяздзе» распавёў Ігар ЛЯШЧЭНЯ, начальнік упраўлення Афрыкі і Блізкага Усходу Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, дыпламат, які ў свой час стаў першым Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом нашай краіны ў Егіпце, адкрыўшы ў Каіры першае беларускае дыпламатычнае прадстаўніцтва ў краінах Афрыкі і арабскага свету.

— Чым супрацоўніцтва з дзяржавамі афрыканскага кантыненту цікавае для нашай краіны?

— Той факт, што Афрыка сапраўды апынулася ў цэнтры ўвагі, з'яўляецца вынікам натуральнага пашырэння знешнеэканамічных сувязяў і развіцця знешняй палітыкі нашай дзяржавы. Першым крокам у гэтым кірунку стала актывізацыя адносін з арабскімі дзяржавамі Паўночнай Афрыкі. Затым прыйшла чарга неарабскіх краін гэтага кантынента, з якімі ён і асацыіруецца. Гэты рэгіён мацерыка прынята называць Афрыкай на поўдзень ад Сахары, і ён вельмі кантрасны. З аднаго боку, менавіта ў Афрыцы на поўдзень ад Сахары знаходзіцца большасць краін, якія па метадалогіі ААН адносяцца да найменш развітых. З іншага — у 2000-я гады краіны менавіта гэтага рэгіёна прадэманстравалі найбольш высокія тэмпы эканамічнага росту — у сярэднім 7,8%.

У пачатку нашага тысячагоддзя Афрыка, якая валодае ўнікальнымі запасамі прыродных рэсурсаў, — ледзь не галоўны прыз глабальнага геаэканамічнага саперніцтва паміж сусветнымі цэнтрамі сілы (Еўрасаюзам, ЗША, Кітаем). Але сваю гандлёва-эканамічную нішу тут могуць знайсці і іншыя краіны, у тым ліку Беларусь. Высокая дынаміка развіцця прадвызначае патрэбы ў тэхніцы, таварах, прадуктах. У той жа час варта разумець, што няма рынкаў свабодных, няма рынкаў неасвоеных, ёсць рынкі перспектыўныя, і мы маем добрыя шанцы прасоўваць на афрыканскі кантынент перш за ўсё нашу прамысловую прадукцыю.

Сёння адносіны Рэспублікі Беларусь з большасцю дзяржаў гэтага кантынента знаходзяцца на пачатковым этапе, што пацвярджаецца і пакуль невялікім аб'ёмам нашага экспарту. Па выніках 2013 года, экспарт у краіны Афрыкі вырас на 1,8% і дасягнуў 294 млн долараў (станоўчае для Беларусі сальда склала больш за 127 млн долараў).

У краінах, дзе функцыянуюць нашы пасольствы, менавіта беларускія дыпламаты выступаюць у якасці першых суразмоўцаў і крыніц інфармацыі аб магчымасцях супрацоўніцтва для большасці патэнцыйных дзелавых партнёраў. Што характэрна, па выніках пяці месяцаў гэтага года, у разы экспарт вырас менавіта ў тыя дзяржавы Афрыкі, дзе размешчаны нашы дыпламатычныя прадстаўніцтвы.

— У Егіпце дзейнічаюць зборачныя вытворчасці Мінскага аўтамабільнага і Мінскага трактарнага заводаў. Аднак таваразварот з гэтай краінай невялікі. За кошт чаго плануецца яго павялічыць? Якія яшчэ перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва з гэтай дзяржавай можна назваць?

— Егіпет, як і іншыя краіны арабскага свету, сёння перажывае даволі складаны перыяд, выкліканы наступствамі «арабскай вясны». Пераадоленне гэтага этапу, вядома, створыць перадумовы для аднаўлення нашага актыўнага супрацоўніцтва. Хоць дзелавыя, гандлёва-эканамічныя сувязі не заміралі ніколі.

Дарэчы, першыя прыкметы стабілізацыі становішча ў Егіпце за пяць месяцаў гэтага года ўжо прывялі да больш чым трохразовага росту беларускага экспарту (каля 48 млн долараў) у гэтую краіну ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам.

Калі казаць аб перспектыўных кірунках супрацоўніцтва з Егіптам, то далёка не вычарпаны магчымасці паставак нашай тэхнікі, прадукцыі нафтахімічнай прамысловасці, лекаў і медыцынскага абсталявання, прадукцыі сельскай гаспадаркі. Не выключана, што павялічыцца і колькасць зборачных вытворчасцяў: прапрацоўваецца магчымасць стварэння сумеснай вытворчасці пад'ёмных кранаў.

— Летась было адкрыта беларускае пасольства ў Эфіопіі. Не сакрэт, што менавіта ў Адыс-Абебе, сталіцы гэтай краіны, знаходзіцца штаб-кватэра найбуйнейшай рэгіянальнай арганізацыі кантынента — Афрыканскага саюза. Што дасць Беларусі ўзаемадзеянне з ім? Якія з дзяржаў — удзельніц саюза могуць у будучыні стаць нашымі важнымі партнёрамі?

— Адкрытае менш за год таму беларускае пасольства ў Эфіопіі адказна не толькі за развіццё адносін з дзяржавамі Усходняй Афрыкі — Кеніяй (дарэчы, 30 чэрвеня наш пасол у Эфіопіі Дзмітрый Купцель прызначаны паслом у Кеніі па сумяшчальніцтве), Танзаніяй, Угандай, Джыбуці, Паўднёвым Суданам, але і за супрацоўніцтва з Афрыканскім саюзам. Пасол у Эфіопіі ўжо акрэдытаваны пры гэтай арганізацыі, што дае магчымасць прапрацаваць перспектывы ўзаемадзеяння з пункту гледжання падключэння Беларусі да рэгіянальных праграм развіцця. Апошнія распрацоўваюцца і рэалізуюцца пры садзейнічанні, падтрымцы, кантролі з боку Саюза. Дыялог з ім перспектыўны і з палітычнага пункту гледжання. Гэта добрая пляцоўка для сустрэч з высокапастаўленымі прадстаўнікамі дзяржаў кантынента.

Калі казаць пра групу ўплыву ў Афрыканскім саюзе ў дачыненні да субсахарскай Афрыкі, то яе якраз і складаюць краіны, дзе ўжо ёсць нашы пасольствы. Гэта Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, Нігерыя і Эфіопія — таксама буйныя дзяржавы і адны з найбольш перспектыўных эканомік на кантыненце.

— Як складваюцца нашы адносіны з адной з самых развітых краін кантынента — Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай?

— ПАР шмат у чым з'яўляецца эканамічным і палітычным лідарам у рэгіёне Афрыкі на поўдзень ад Сахары. Гэта сапраўды найбольш развітая дзяржава, хоць яе поспехі ў развіцці пачынаюць аспрэчвацца і іншымі афрыканскімі эканомікамі. Зараз найбольшую зацікаўленасць у дыялогу, у абмене візітамі мы адчуваем як з боку Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі, дзе было адкрыта першае наша дыппрадстаўніцтва ў Афрыцы на поўдзень ад Сахары, так і з боку суседніх краін, у якіх па сумяшчальніцтве акрэдытаваны наш пасол у Прэторыі.

Актывізавалася наша супрацоўніцтва з Мазамбікам, дзе па сумяшчальніцтве акрэдытаваны беларускі пасол у ПАР. У маі мінулага года дэлегацыя Беларусі на чале з намеснікам міністра замежных спраў прыняла ўдзел у цырымоніі адкрыцця выставы беларускай тэхнікі ў сталіцы Мазамбіка горадзе Мапуту. Там жа створана прадпрыемства «Бел-Афрыка», якое спецыялізуецца на пастаўках і распаўсюджванні беларускай тэхнікі.

Павінен сказаць, што прадстаўнікі і ПАР, і Мазамбіка праяўляюць цікавасць да нашага вопыту стварэння аграгарадкоў. На гэтым этапе бакі вывучаюць магчымасць стварэння ў ПАР сумесных прадпрыемстваў па перапрацоўцы малака і мяса птушкі, будаўніцтва аграгарадкоў з поўным цыклам вытворчай і сацыяльнай інфраструктуры, удзелу беларускага боку ў развіцці рыбнай галіны ПАР. Для мазамбікскіх партнёраў праведзена прэзентацыя праекта «Арганізацыя буйнатаварнага сельскагаспадарчага прадпрыемства ў Рэспубліцы Мазамбік» з улікам паставак беларускай тэхнікі.

Прадстаўнікі і ПАР, і Мазамбіка праяўляюць непадробную цікавасць да нашага вопыту стварэння аграгарадкоў.

— Раскажыце пра сумесныя праекты з Нігерыяй, дзе таксама адкрыта беларускае пасольства.

— Нігерыя сёння з'яўляецца той краінай, якая ў эканамічным плане спрабуе кінуць выклік ПАР. І па выніках 2013 года, у яе атрымалася зрабіць гэта. Нігерыя стала першай эканомікай рэгіёна па аб'ёме валавога ўнутранага прадукту, які склаў 510 млрд долараў ЗША і перавысіў аб'ём ВУП ПАР. Нігерыя з'яўляецца ключавым удзельнікам эканамічнай супольнасці краін Заходняй Афрыкі. Нігерыя таксама лідар у Афрыцы па колькасці насельніцтва: у краіне пражывае каля 170 млн чалавек. Да ліку нашых цікавых праектаў у Нігерыі, вопыт рэалізацыі якіх мы будзем спрабаваць распаўсюдзіць у іншых краінах, адносіцца адкрыццё ў пачатку чэрвеня гэтага года ў горадзе Лагасе беларускага гандлёвага дома. Ён прадстаўляе інтарэсы Мінскага трактарнага завода, а таксама заводаў «Белаграмаш», «Керамін» і «Атлант». Там жа працуе секцыя навучных гадзіннікаў вытворчасці Мінскага гадзіннікавага завода, плануецца адкрыццё гандлёвай секцыі прадукцыі беларускай дрэваапрацоўкі.

Адзін з найбольш цікавых праектаў — супрацоўніцтва ў галіне экспарту адукацыйных паслуг. Цяпер у беларускіх ВНУ вучыцца каля шасцісот студэнтаў з Нігерыі — найбольш шматлікая група студэнтаў з афрыканскіх краін.

Вядзецца работа па стварэнні ў Нігерыі філіяла факультэта папярэдняй падрыхтоўкі з удзелам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. Філіял факультэта ствараецца на базе ўніверсітэта Дэльты Нігеру. Дзвюма гэтымі ВНУ ўжо ўзгоднены праект адпаведнага пагаднення. Пакуль што такое супрацоўніцтва ў сферы адукацыі ўнікальнае для рэгіёнаў Афрыкі і Блізкага Усходу.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■



Прырода і традыцыі афрыканскіх краін вельмі адрозніваюцца ад нашых, але і там патрэбна наша тэхніка.

■ Жыццё з ВІЧ

ДЗЕЦІ БЫВАЮЦЬ «СТАНОЎЧЫЯ»

З моманту рэгістрацыі ВІЧ-інфекцыі ў Беларусі ад ВІЧ-інфіцыраваных маці нарадзілася 2 621 дзіця. Дыягназ «ВІЧ-інфекцыя» — у 239 дзяцей, народжаных ад ВІЧ-пазітыўных маці (13 з іх памерлі). Усяго ў краіне — 255 дзяцей з ВІЧ ад 0 да 15 гадоў. Асноўная колькасць атрымала вірус ад маці (астатнія заразіліся тымі ж шляхамі, што і дарослыя). Сёння ўсяго 2 працэнтам немаўлят выстаўляецца пазітыўны дыягназ. Абумоўлена гэта тым, што некаторыя жанчыны не становяцца на ўлік па цяжарнасці, а значыць, не праходзяць тэст на ВІЧ і не далучаюцца да неабходных прафілактычных мерапрыемстваў.

ПРАФІЛАКТЫКА ДЛЯ ЎСІХ ЦЯЖАРНЫХ

У жаночай кансультацыі падчас пастаноўкі на ўлік усім жанчынам прапануецца тэсціраванне на ВІЧ. Яно праводзіцца двойчы — у першым і апошнім трыместрах цяжарнасці, паколькі з моманту інфіцыравання на працягу 3-6 месяцаў чалавек можа заставацца ВІЧ-адмоўным.

ПРАФІЛАКТЫКА ДЛЯ ВІЧ-СТАНОЎЧЫХ ЖАНЧЫН

✓Прыём антырэтравірусных прэпаратаў.

✓Абследаванне на вірусную нагрузку перад родамі. Калі яна высокая, жанчыне прапануецца кесарава сячэнне.

✓Пераход на замяшчальнае грудное кармленне (да 1 года малочная сумесь прапануецца бясплатна).

✓Антырэтравірусная тэрапія для нованароджанага.

Сёлета звыш 100 жанчын з ВІЧ вырашылі стаць маці. Немаўлят такіх матуль двойчы на працягу першага года жыцця абследуюць на наяўнасць антыцелаў да ВІЧ. Аднак канчаткова ВІЧ-статус вызначаецца праз 1,5 года. Станоўчы статус азначае дыспансернае назіранне на працягу ўсяго жыцця. У дзіцячых паліклініках дзяцей назіраюць урачы-інфекцыяністы або ўрачы-педыятры сумесна са спецыялістамі кансультацыйна-дыспансерных кабінетаў. У Мінску — на базе гарадской дзіцячай інфекцыйнай бальніцы, а ў абласцях ёсць абласныя кабінеты, у якіх дзяцей кансультуюць двойчы ў год. Функцыянуе ў мінскай дзіцячай інфекцыйнай і кабінет комплекснага аказання паслуг сем'ям, якіх закрануў ВІЧ. Тут працуюць урачы — інфекцыяніст, педыятр, псіхолаг і педагог-дэфектолаг.

У Мінску пражывае 25 ВІЧ-пазітыўных дзяцей. Толькі трое з іх жывуць у поўных сем'ях, 6 — у дзіцячых дамах, 4 — у апякунскіх сем'ях. Некалькі чалавек знаходзяцца ў сем'ях прыёмных, астатнія пражываюць у няпоўных, з матулямі. Вядома, дзеці, што пражываюць не ў дзіцячых дамах, наведваюць звычайныя паліклінікі, садкі, школы. Апытанні паказваюць, што далёка не ўсе дарослыя талерантна ставяцца нават да самой верагоднасці.

— Для навакольных у бытавых умовах ВІЧ-пазітыўны дарослы або дзіця не ўяўляюць ніякай пагрозы, — тлумачыць **загадчыца аддзялення Мінскай гарадской дзіцячай інфекцыйнай бальніцы Галіна ЛАПІЦКАЯ.** — Пад бытавымі ўмовамі варта разумець карыстанне агульным посудам, ручнікамі, пасцельнай бялізнай, ваннай, прыбіральняй... Вірус імунадэфіцыту вельмі няўстойлівы ў навакольным асяроддзі. Ён адчувальны да ўсіх дэзынфікуючых сродкаў, у тым ліку да туалетнага мыла.

Калі ж ВІЧ-станоўчае дзіця атрымала траўму, паранілася, то і тут не трэба хвалявацца, паколькі прынцыпы аказання меддапамогі ў такіх выпадках аднолькавыя для ўсіх. Элементарныя гігіенічныя нормы вытрымліваюцца ў дачыненні да любога пацыента. Спецыфічных мер не патрабуецца. З другога боку, мы матывуем бацькоў на тое, каб яны ўсё ж такі паведамлялі хоць бы таму ж кіраўніку садка ці школы аб асаблівасцях здароўя свайго дзіцяці. Што называецца, на ўсякі выпадак. А кожны работнік цудоўна ведае пра адказнасць за распаўсюджванне канфідэнцыяльнай інфармацыі. Між тым, практыка паказвае, што нашы людзі вельмі апасаюцца ўцечкі інфармацыі і ніхто добраахвотна пакуль не адкрываецца. Гэта азначае, што мы павінны больш гаварыць аб гэтай праблеме, разбураць жывучыя стэрэатыпы, замацаваныя ў нашым грамадстве.

ВЫДАТНЫЯ ВЫНІКІ

Сусветная арганізацыя аховы здароўя апублікавала штогадовы зборнік даных «Сусветная статыстыка аховы здароўя 2014», дзе прадстаўлены аналіз выканання краінамі мэт развіцця тысячагоддзя і глабальных паказчыкаў у галіне здароўя, у якім дадзена высокая ацэнка сістэме аховы здароўя Беларусі.

Да мэтаў развіцця тысячагоддзя адносіцца ў тым ліку і барацьба з ВІЧ/СНІДам.

Задача №1. Спыніць да 2015 года распаўсюджванне ВІЧ/СНІДу і пакласці пачатак скарачэнню захваральнасці.

Па сярэднегадавых тэмпах зніжэння распаўсюджанасці ВІЧ/СНІДу ў 2001-2012 гг. Беларусь займае сярод дзяржаў СНД 2-е месца.

Задача №2. Да 2010 года забяспечыць доступ да лячэння для ўсіх, хто ў гэтым мае патрэбу.

Беларусь сярод краін СНД лідзіруе па паказчыку ахоплівання антырэтравіруснай тэрапіяй.

ЗУБЫ БЕЗ «ДУПЛАЎ»

■ Карысныя звычкі

Як трымаць зубную шчотку? Колькі пасты будзе дастаткова? Гэта ўсё важна, але не меншае значэнне мае і ўкараненне ў дзяцей самой звычкі чысціць зубкі двойчы на дзень. Паліклінікі праводзяць з гэтай мэтай спецыяльныя майстар-класы.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Ліст у рэдакцыю

МЕДЫКАМ МЫ ДАВЯРАЕМ НІ МНОГА НІ МАЛА — ЖЫЦЦЁ

Вырашыла напісаць, бо прамаўчаць не магу. Адразу прызнаюся: гісторыя, пра якую хачу расказаць, закранула мяне і маіх родных, таму прашу прабачэння за магчымыя эмоцыі.

Нядаўна ў нашай сям'і надарылася радасная падзея: пляменніца нарадзіла першага сыночка. Адбылося гэта ў адным сталічным раддоме. Дзякуй Богу, роды прайшлі нармальна. Пасля яе з малым змясцілі ў палату, дзе было яшчэ чатыры парадзіхі і трое немаўлят. Можаце сабе ўявіць, як «весела» было мамачкам! Ім бы крыху адпачыць, набрацца сіл — ды дзе там: адно малое толькі сціхае, другое пачынае... І так круглыя суткі. Муж пляменніцы хацеў аплаціць асобную палату, але і там усё занята, і там па двое. Вось што хачу сказаць: радасна, вядома, за краіну: павышаецца нараджальнасць. Але, мабыць, існуюць недапрацоўкі, калі мы не можам стварыць нашым жанчынам адпаведных умоў для аднаўлення пасля родаў. Яны ж — ад недасыпання, ад пастаяннага дзіцячага плачу — ледзь трымаюцца на нагах!.. Лічу, калі чалавек выказвае жаданне аплаціць знаходжанне ў платнай палаце і аказанне нейкіх медыцынскіх паслуг, яму трэба даць такую магчымасць.

Радасна, вядома, за краіну: павышаецца нараджальнасць. Але, мабыць, існуюць недапрацоўкі, калі мы не можам стварыць нашым жанчынам адпаведных умоў для аднаўлення пасля родаў.

Мы сваю супакойвалі: маўляў, цяснота — не крывота. Дый суседкі па палаце могуць штосьці адна адной падказаць, у нечым дапамагчы...

Хлопчык жа, як на тое, не ўзяў грудзі — а малако прыбывала. Жанчыны, якія сутыкаліся з такой праблемай, ведаюць: трэба сцэджвацца, а інакш быць хваробе. Наша ж маладая яшчэ, нявопытная. Ну ніяк у яе не атрымліваецца — грудзі наліліся, разбалеліся. Пляменніца расхвалявалася — малы, адчуўшы яе настрой, таксама закапрызіў. Як на мой розум, хто павінен быў дапамагчы, навучыць? Маці і свякроўка, бабулі — з радасцю б! Ды хто іх у раддом пусціць? Безумоўна, уся надзея на медперсанал. Ды дзе там! «У мяне вунь колькі палат! Я паказала як, а далей — сама», — прамовіла медсястра, калі дзяўчына звярнулася па дапамогу. Яна зноў пачала няўмела сцэджвацца... На трэція суткі пасля родаў яна ўжо не адчувала ні грудзей, ні рук. Не вытрымала свякроў, паехала ў раддом. Думала, папросіць, можа, хто хоць за грошы навучыць, падкажа... Зноў не. Прыехала дадому, патэлефанавала загадчыцы аддзялення. Не ведаю, як размаўляла з урачом свякроў, але не стану яе за гэта асуджаць — яна прасіла хоць нечым дапамагчы нявестцы. Дый наогул, на каго тады, калі не на медыкаў, спадзявацца, знаходзячыся ў бальніцы?

Загадчыца прыйшла ў палату, пацікавілася: «Чыя мама скардзілася?». Потым паглядзела на пляменніцу і яе грудзі і, кінуўшы: «нічога страшнага», пайшла. Медсястра ж выдзеліла яшчэ пару хвілін свайго «каштоўнага» часу, некалькі разоў «жмякнуўшы» грудзі дзяўчыны. Усё — на зварот адрэагавалі. Астатні персанал між сабой: «Яна проста лянуецца...» Нічога сабе лянуецца — нацерла грудзі, можна сказаць, да мазалёў!

Абурэнню не было мяжы. Але што абураца? Наперадзе ноч — трэба ж нешта рабіць. І тут адна жанчына, у якой нядаўна таксама дачка нарадзіла, падказала: ёсць у аптэках малакаадсосы; яны, праўда, дарагаватыя, але ж эфектыўныя! А пасля яшчэ высветлілася, што ў яе ёсць знаёмая медсястра менавіта ў гэтым раддоме. Ёй патэлефанавалі, папрасілі, каб яна падышла да пляменніцы, дапамагла. Тая не адмовіла (мы ўсе ёй за гэта вельмі ўдзячныя) — паказала, як правільна масіраваць грудзі і сцэджваць малако. А ўжо вечарам мы прывезлі малакаадсос. Трэба сказаць, ён і сапраўды дапамог маладой маме...

Вось тут у мяне ўзнікла пытанне: чаго чакаў персанал аддзялення — пакуль не разаўецца мастыт? Няўжо ні ўрач, ні тая медсястра не ведалі пра малакаадсос? А калі ведалі, дык чаму не параілі? Разумею, мне скажуць: «Гэта для вас родны чалавек, а для іх яна — адна з патоку. Гэта іх штодзённая праца, якая, да таго ж, нізка аплачваецца». Згодна. І ўсё ж пераканана: нават на нізкаплатнай працы неабыякавы чалавек не дазволіць сабе такога стаўлення да сваёй справы, ды яшчэ калі гэта тычыцца здароўя каго-небудзь! Тым больш — і гэта мы ўсе цудоўна ведаем — хворыя і іх родныя заўсёды гатовы аддзячыць доктару, і так было спакон веку. Не, я ні ў якім разе не апраўдваю хабары і паборы, але такое жыццё...

Вольга КУЛІНКОВІЧ, *г. Мінск.*

ІДЭАЛЬНАЯ ЕЖА ДЛЯ НЕМАЎЛЯТ

Гэта, вядома, пра мацярынскае малако. І вельмі важна правільна наладзіць грудное кармленне ў першыя дні пасля нараджэння. Майце на ўвазе некалькі важных фактаў.

1. Любая матуля, незалежна ад спосабу з'яўлення дзіцяці на свет, здольна выкарміць дзіця.

2. Вельмі важнымі з'яўляюцца частыя і начныя кармленні. Стрэс, боль, расстройства маці блакіруе адзін з важных гармонаў, які перашкаджае адтоку малака.

Паводле слоў **валеолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алены ГАРНІЦКАЙ,** у першыя дні пасля родаў (або яшчэ падчас цяжарнасці) у мам выпрацоўваецца малозіва — канцэнтрат імунаглабулінаў, якія з'яўляюцца «прышчэпкай» ад многіх інфекцый, а таксама рэчываў, якія дапамагаюць засяленню кішэчніка добрай мікрафлорай, яшчэ бялку, вітаміну А, соляў. Невялікай колькасці гэтага малозіва дзіцяці абсалютна дастаткова.

❍Шэраг радзільных дамоў падтрымлівае 10 прынцыпаў натуральнага кармлення, распрацаваных ААН/ЮНІСЕФ. Гэта важна для наладжвання лактацыі з першай гадзіны. У такіх раддамах можна папрасіць персанал дапамагчы прыкласці дзіця да грудзей пасля родаў. Вельмі важна знаходзіцца з дзіцём разам, карміць яго неабмежавана часта і працягла.

❍Калі ў радзільнай зале прыкладання не было, можна прасіць персанал не дакормліваць сумессю і дапамагчы прыкласці да грудзей у максімальна кароткі тэрмін пасля родаў. Гэта ваша дзіця, і ваша права — чым і як яго карміць. Калі ў штаце няма спецыяліста па натуральным кармленні, можна прасіць дапамогі ў медсястры дзіцячага аддзялення або акушэркі — яны ўсе ў вышэйзгаданых раддамах абавязаны навучыць маладую маці прыкладанню малога да грудзей.

❍Пры большасці планавых кесаравых сячэнняў першае прыкладанне да грудзей таксама магчымае. Гэта робіцца адразу пасля нараджэння ў аперацыйнай. Акрамя таго, сучасныя метады правядзення аперацыі дазваляюць скараціць час знаходжання мамы ў аддзяленні інтэнсіўнай тэрапіі, і праз 12 гадзін яе ўжо можна перавесці ў паслярадавае аддзяленне. Важна, каб малое ў гэты час не дакормлівалі.

❍Боль падчас прыкладання — сігнал аб тым, што вы няправільна гэта зрабілі. Калі дзіця смактала соску, яно будзе «з'язджаць» на сасок, а гэта і прычыняе боль і дрэнна спустошвае грудзі. Дзіця, накормленае сумессю ці напоенае вадой, не возьме грудзі, а будзе спаць. А гэта дрэнна для стымуляцыі грудзей, прыбывання малака, прыводзіць да хваравітага нагрубання грудзей.

❍Калі дзіця нарадзілася аслабленым, не можа смактаць і сумеснае знаходжанне немагчымае, неабходна навучыцца сцэджвацца, а пасля перадаваць малако малому ў дзіцячае аддзяленне, каб яго кармілі гэтым малаком. Тут спатрэбіцца апарат для адсмоктвання малака і рэгулярныя, кожныя 2-3 гадзіны, сцэджванні грудзей, у тым ліку ноччу. Гэта дазволіць падтрымаць лактацыю.

ЯК ПРЫКЛАДВАЦЬ

Звычайна кансультанты па натуральным кармленні паказваюць, як прыкласці дзіця ў любой позе — лежачы, седзячы, стоячы, абы толькі і маме, і немаўляці было зручна. Можна павучыцца і самой.

Неабходна зручна размясціцца на нейкі працяглы час. Малое лепш пакінуць у адным падгузніку. Кантакт «скура да скуры» вельмі важны для лактацыі, бо дае матулі выбух гармонаў лактацыі.

Размясціце дзіця так, каб яго жывоцік быў паралельны вашаму целу. Носік (не рот!) дзіцяці павінен глядзець на сасок. Пад галоўку завядзіце руку і дачакайцеся, пакуль малое шырока адкрые роцік. Калі яно задумалася, правядзіце пальцам па яго губках. Як толькі малое шырока адкрыла роцік, падштурхніце рукой яго галаву да грудзей (а не самі целам рухайцеся да яго). Сасок, калі сасклізне з верхняй губы і паднябення, акажацца глыбока ў роце. Калі ж сасок будзе размешчаны на ўзроўні рота, дзіця не захопіць грудзі глыбока і правільна.

Няправільнае прыкладанне прыводзіць да ўзнікнення трэшчын на сасках. Лячыць іх бесэнсоўна, калі не папраўліць прыкладанне і не пазбавіцца сосак і дакорму з бутэлькі. Залячыць трэшчыны дапамагае паветра і само малако. Трэба як мага даўжэй хадзіць з адкрытымі грудзямі і пасля кармлення пакідаць на сасках некалькі кропель малака. Паміж кармленнямі неабходна карыстацца крэмамі з ланалінам. Змываць іх не трэба. Ні ў якім разе нельга карыстацца зялёнкай.

Каб справіцца з прытокам малака, трэба часта і актыўна карміць малое. Пры неабходнасці — сцэджвацца, але толькі да пачуцця палёгкі, каб малому было прасцей узяць не надта шчыльныя грудзі. Нельга сцэджвацца пасля кармлення да апошняй кроплі — гэта прывядзе да празмернай лактацыі, расцяжак і застою малака.

Дзіця павінна смактаць столькі, колькі яму захочацца. Калі ж вам неабходна зрабіць паўзу, дакраніцеся пальцам да языка дзіцяці, і яно перастане смактаць. Калі мама сама адбірае грудзі, дзіця можа зашчаміць сасок, а гэта прывядзе да з'яўлення трэшчын.

Краіна здароўя

Выпуск № 11 (322)

■ Інфарм-укол

А САЛАЦІК СВЕЖЫ?

Вострыя кішэчныя інфекцыі таму так і называюцца, што востра атакуюць страўнікава-кішачны тракт, куды трапіў нейкі інфекцыйны агент. Агентаў гэтых неверагодная колькасць. Свет густа населены мікраарганізмамі, якіх мы не бачым, але яны ёсць! Той, хто не жадае ўсведамляць гэта, становіцца іх ахвярай. Сёлета было зафіксавана звыш 6,5 тысячы такіх фактаў. І, зразумела, гэта не ўсе выпадкі, паколькі ў большасці падобных сітуацый хворым не патрабуецца спецыяльная медыцынская дапамога.

Спецыялісты кажуць, што самае важнае — не дапусціць масавых заражэнняў у тых жа дзіцячых калектывах, аздараўленчых летніках і г.д., што бывае звязана з ужываннем няякасных прадуктаў харчавання і вады. Сёлета такіх успышак не было. Самае важнае, што павінен мець на ўвазе кожны з нас — мы самі адказваем за тое, што спажываем. Гэта яшчэ называецца прафілактыкай на асабістым узроўні. Якімі б жорсткімі ні былі для гандлю меры пакарання за парушэнне правілаў рэалізацыі прадуктаў (а гэта досыць вялікія штрафы), пакупнік не павінен губляць пільнасць. Наўмысна ніхто нікога труціць не хоча, аднак цалкам расслабляцца не варта ў любым выпадку, паколькі ніхто не адмяняў чалавечы фактар. Хадзіць па прадуктовым аддзеле варта з усведамленнем важнасці справы — прыглядаючыся да ўсяго, на чым спыняецца выбар. Умовы захоўвання і тэрмін прыдатнасці павінны хваляваць нас нават больш, чым тое, наколькі смачнай акажацца пакупка. Калі вы заўважылі нейкае парушэнне, неабходна звярнуць увагу адміністрацыі ўстановы. Аднак калі парушэнні носяць сістэмны характар, скаргі трэба накіроўваць у Міністэрства гандлю.

Узбуджальнікі шэрагу інфекцый таксама любяць цёплы час года.

Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендуе прытрымлівацца некаторых правілаў:

1 Чысціня. Падчас гатавання ежы заўсёды чыстымі павінны быць рукі, рабочыя паверхні, абсталяванне, посуд.

2 Раздзяленне сырога і прыгатаванага. Каб мікраарганізмы з сырога мяса, рыбы, малака не трапілі ў гатовыя прадукты, іх трэба асобна гатаваць і захоўваць у закрытым посудзе.

3 Тэрмічная апрацоўка. Малочныя і мясныя прадукты павінны падвяргацца тэрмічнай апрацоўцы, што цалкам знішчае або істотна змяншае колькасць мікробаў.

4 Умовы захавання. Прыгатаваныя стравы (асабліва мясныя, а таксама салаты з маянэзам/смятанай) могуць захоўвацца пры тэмпературы не вышэй за +5 градусаў. Неабходна ўлічваць, што халадзільнае абсталяванне (як у гандлёвых залах, так і дома) не так эфектыўна спраўляецца са сваёй задачай, калі тэмпература паветра ўзнімаецца вышэй за 30 градусаў.

5 Ужыванне надзейных прадуктаў і вады. Нельга набываць прадукты «з зямлі» (стыхійнага гандлю) і піць небутыляваную і негатаваную ваду.

— Шпіталізацый, звязаных з вострымі кішэчнымі інфекцыямі, у сталіцы у апошнія гады ўсё менш, — тлумачыць **намеснік галоўнага ўрача па лячэбнай рабоце Мінскай гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы Святаслаў ВЕЛЬГІН.** — Найчасцей сустракаюцца гастраэнтэрыты, звязаныя з парушэннем захоўвання, правілаў чысціні падчас гатавання. Дзеці, а следам за імі і дарослыя нярэдка пакутуюць ад вірусных гастраэнтэрытаў — ротавіруснай інфекцыі. Фіксуецца на працягу года некалькі выпадкаў батулізму, што звязана з ужываннем няправільна прыгатаваных мясных, грыбных, рыбных кансерваў.

Паводле слоў **загадчыка супрацьэпідэмічнага аддзялення Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Дзмітрыя ГАЛОЦІКА,** калі падчас вострага кішэчнага захворвання хворага непакоіць не толькі моцная дыярэя, але і высокая тэмпература з ванітамі, неабходна звярнуцца да ўрача. Іначай можна стаць у выніку носьбітам бактэрыі дызентэрыі. У выпадках «лёгкіх атручэнняў» рэкамендуецца мець у хатніх аптэчках ніфураксазід, цыпрафлаксацын, а таксама энтэрасарбенты кшталту смекты і актываванага вуглю. Падчас дыярэі неабходна таксама спажываць вялікую колькасць вады. Можна прымяняць і салявыя сумесі, якія ў сухім выглядзе прадаюцца ў аптэках (нормагідрон у парашку).

ПАРАДЫ АД ЖЫЦЦЯ

✓Не ўжывайце сырыя яйкі — ні курыныя, ні перапялініныя. Гэта не толькі некарысна, але і небяспечна, паколькі пакідае рызыку захворвання на сальманелёз. Яйкі трэба добра смажыць і варыць.

✓Практыка сведчыць, што атручэнні падчас тых жа вясковых вяселляў летам здараюцца не па віне грамадскага харчавання, а па віне клапатлівых гаспадынь, якія намагаюцца карміць гасцей стравамі, прыгатаванымі на некалькі дзён наперад.

✓Калі вы — аматар гатовых і паўгатовых вырабаў кулінарыі, то абавязкова сачыце за тэрмінамі рэалізацыі такой прадукцыі і абавязкова прымяняйце самую працяглую тэрмічную апрацоўку, якая калі не цалкам вынішчае хваробатворныя мікробы, то значна зніжае іх колькасць, што робіць прадукт бяспечным.

✓Нават самая сур'ёзная тэрмічная апрацоўка не зробіць дзічыну бяспечнай, калі яна заражана, скажам, трыхінелямі. Тут патрэбен толькі ветэрынарны агляд.

✓У грамадскіх месцах лепей карыстацца вадкім мылам — так бы мовіць, аднаразовага выкарыстання. Мыла шматразовага карыстання (цвёрдае) само па сабе збірае некаторыя бактэрыі.

✓Падтрымлівайце чысціню не толькі на ўзроўні, скажам, кухоннага стала, а наогул — ва ўсёй кухні, на ўсіх паверхнях. ■

■ Дзякуй!

ДАКТАРЫ, МЕДСЁСТРЫ І ЎСЕ ЯНЫ РАЗАМ...

Мне 84 гады. Цяжкае жыццё пражыла, зведала гора напоўніцу. Была вайна, была кантузія. А потым з руін падымалі краіну.

Я ўсё ўмела рабіць — хоць з касой, хоць з плугам, хоць з пілой ці сякерай. Лёгка запрагала вала, што ў вёсцы маглі рабіць толькі два мужчыны, год працавала на птушніку, потым — на цялятніку, дзе «затрымалася» ажно да пенсіі, хоць праца была не з лёгкіх, бо ўсё рабілі ўручную. Але я старалася, клапацілася пра цялятак, была адной з лепшых працаўніц у сваім калгасе.

А дома была сям'я, чацвёра дзяцей. Са школы, а пазней і з Беларускай сельгасакадэміі да нас з мужам Міхаілам (ён быў інвалідам вайны другой групы) неаднойчы прыходзілі падзякі за іх выхаванне...

Час імчыць. Пахавала я мужа, разляцеліся з роднага гнязда дзеці. Усе добра працуюць, падарылі мне ўнукаў, праўнукаў. Адно дрэнна: гады бяруць сваё, хварэю. У сярэдзіне красавіка падскочыў ціск, паднялася тэмпература, давялося двойчы выклікаць «хуткую» дапамогу.

Пазваніла і ў Крупкі сярэдняй дачцэ. Яны з зяцем тут жа прыехалі, угаварылі пажыць у іх. Так я трапіла ў раённую бальніцу.

Не чакала, што да старога чалавека, ды яшчэ з іншай вобласці, медыкі праявяць столькі клопату і спагады. Абследавалі мяне, зрабілі прызначэнні. І, відаць жа, правільна, калі праз некалькі дзён, дзякуючы загадчыкам тэрапеўтычнага і хірургічнага аддзялення Віктару Генрыхавічу Маліноўскаму і Генадзю Аляксандравічу Паўлюкевічу, кардыёлагу Валерыю Міхайлавічу Арлоўскаму і хірургу Андрэю Пятровічу Краўчанку, мне стала значна лягчэй.

Умелыя рукі і добрыя сэрцы і ў медсястрычак Таццяны Уладзіміраўны Герасіменкі, Ларысы Іванаўны Крупень, Ірыны Уладзіміраўны Казак, Галіны Васільеўны Рэўт... Чулыя і руплівыя ў бальніцы санітарачкі, паважлівыя буфетчыцы. А ўсе разам яны ствараюць атмасферу, у якой пацыенты папраўляюцца хутчэй. Мне цяжка падабраць словы, каб выказаць ім удзячнасць!

Цяпер я дома, у Горацкім раёне. Адкуль і хачу даслаць самыя шчырыя пажаданні здароўя, дабрабыту і ўдзячных пацыентаў усім сваім выратавальнікам.

Таццяна Фёдараўна КАРНАУХАВА, ветэран працы,

п. Леніна Горацкага раёна

■

Матэрыялы старонкі падрыхтава Святлана БАРЫСЕНКА.

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»
с 12 августа 2014 г.

белагропромбанк традиции будущего

Сумма депозита, ед. валюты	Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками (% годовых)							Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками (% годовых)					
	Срок, дни							Срок, дни					
	100	200	300	500	1 000	2 000	3 000	100	200	300	500	1 000	2 000
Белорусские рубли													
1 – 1 000 000	29,5	30,5	30,8	32	32,3	32,6	32,9	9,00	9,50	10,00	10,50	11,00	11,50
1 000 001 – 10 000 000	29,6	30,6	30,9	32,1	32,4	32,7	33	9,25	9,75	10,25	10,75	11,25	11,75
10 000 001 и более	29,7	30,7	31	32,2	32,5	32,8	33,1	9,50	10,00	10,50	11,00	11,50	12,00
Доллары США													
1 – 500	4,00	4,10	4,40	4,70	5,00	5,25	5,40	3,00	3,80	4,40	4,80	5,20	5,60
501 – 5 000	4,00	4,20	4,50	4,80	5,10	5,30	5,45	3,30	4,00	4,60	5,00	5,40	5,80
5 001 и более	4,00	4,30	4,60	4,90	5,20	5,35	5,50	3,60	4,20	4,80	5,20	5,60	6,00
Евро													
1 – 500	4,00	4,10	4,40	4,70	5,00	5,25	5,40	3,00	3,80	4,40	4,80	5,20	5,60
501 – 5 000	4,00	4,20	4,50	4,80	5,10	5,30	5,45	3,30	4,00	4,60	5,00	5,40	5,80
5 001 и более	4,00	4,30	4,60	4,90	5,20	5,35	5,50	3,60	4,20	4,80	5,20	5,60	6,00
Российские рубли													
1 – 15 000	6,30	6,60	6,90	7,10	7,60	7,90	8,20	4,50	5,30	5,90	6,30	6,70	7,10
15 001 – 150 000	6,40	6,70	6,95	7,20	7,70	7,95	8,30	4,80	5,50	6,10	6,50	6,90	7,30
150 001 и более	6,50	6,80	7,00	7,50	7,80	8,00	8,50	5,10	5,70	6,30	6,70	7,10	7,50

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 14.06.2013 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) «СИСТЕМА СБЕРЕЖЕНИЙ ЛИНИЯ РОСТА 2.0»
с 11 июля 2014 года

белагропромбанк традиции будущего

Сумма депозита, ед. валюты	Сроки (% годовых)			
	до 6 месяцев 90–180 дней	**от 6 месяцев до 1 года** 181–370 дней	**от 1 года до 2 лет** 371–740 дней	**от 2 до 5 лет** 741–2000 дней
Белорусские рубли				
1–10 000 000	**33,5**	**34,5**	**35,5**	**35,8**
10 000 001–50 000 000	**33,6**	**34,6**	**35,6**	**35,9**
50 000 001 и более	**33,7**	**34,7**	**35,7**	**36**
Доллары США, Евро				
1 – 500	**4,40**	**4,70**	**5,00**	**5,30**
501 – 5 000	**4,50**	**4,80**	**5,10**	**5,40**
5 001 и более	**4,60**	**4,90**	**5,20**	**5,50**
Российские рубли				
1 – 15 000	**8,40**	**8,80**	**9,10**	**9,30**
15 001 – 150 000	**8,50**	**8,90**	**9,15**	**9,40**
150 001 и более	**8,60**	**9,00**	**9,20**	**9,50**

Настоящие ставки применяются:
для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в белорусских рублях, заключенных с 01.08.2013 до 11.07.2014 – с 12.08.2014;
для договоров срочного банковского вклада (депозита) «Система сбережений Линия роста 2.0» в белорусских рублях, заключаемых с 11.07.2014 – с 11.07.2014.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 14.06.2013 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

белагропромбанк традиции будущего

